ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

№ 20

24 кастрычніка 1932 г.

г. Менск

Цана асобнага нумару 5 кап.

Орган арганізацыйнага камітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР

Перабудове--бальшавіцкія тэмпы

Партыя, рабочая кляса і працоўныя масы нашай краіны ў сучасны момант надводзяць вынікі дасягненьням сацбудаўніцтва за пятнаццаць год. Гэтыя дасягненьні грандыёзныя. Няма такой галіны, дзе-б мы не дасяглі вялізарных посьпехаў, дзякуючы няўхільнаму правядзенью генеральнай лініі партыі, дзякуючы наступленьню сацыялізму на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце. Перамогі на вучастку ідэалёгічнай барацьбы ў такой-жа ступені настолькі бясспрэчныя, што пра іх ня прыходзіцца доўга гаварыць. Мы робімся краінай суцэльнай пісьменнасьці, мы зьяўляемся цытадэльлю марксызму-ленінізму, у нас адбываецца росквіт навукі і мастацтва, які авалодваюць масы.

Усё гэта асабліва яскрава выступае на фоне эканамічнага крызісу і заняпаду духоўнай культуры ў буржуазных краінах, у тых краінах, дзе пралетарыят і прыгнечаныя масы з'ядноўваюць свае сілы для апошняга вырашальнага бою па прыкладу савецкага пралетарыяту, што пад сьцягам Леніна перамог у Кастрычніку 1917 году.

Бясспрэчна тое палажэньне, што пэрспэктывы надыходзячай другой пяцігодкі, якія адкрываюцца перад намі, канчатковай ліквідацыі клясавага грамадзтва і пабудовы сацыялізму патрабуюць напружаньня ўсіх сіл, большай энэргічнай і энтузіясцкай работы на ўсіх вучастках клясавай барацьбы, на фронце літаратуры і мастацтва патрабуецца вялізарнейшая мабалізацыя сіл для таго, каб актыўна ўдзельнічаць у выкананьні дырэктывы партыі пра ліквідацыю рэштак капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей.

Гістарычная пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23-га красавіка пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый ёсьць тая дырэктыва да дзеяньня, на аснове якой мы павінны перабудаваць усю работу на базе новых пастаўленых партыяй задач перад літаратурай і мастацтвам.

Новы вышэйшы этап у разьвіцьці літаратуры і мастацтва зрабіўся магчымым на аснове дадатных вынікаў пройдзенага.

Было-б зусім няправільным думаць, што савецкая літаратура і мастацтва СССР нічога не дасягнулі за гады свайго існаваньня; было-б найвялікай памылкай адмаўляць ці змазваць дасягненьні ў гэтай галіне,—гэта супярэчыць пастанове ЦК УсеКП(б) ад 23-га красавіка. Што тычыцца гэтых дасягненьняў у БССР, дык сакавіковы пленум ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове «аб культбудаўніцтве БССР» запісаў:

«Пленум ЦК і ЦКК адзначае значныя дасягненьні ў галіне разгортваньня мастацтва ў БССР: мастацкая літаратура, тэатр, кіно, выяўленчае мастацтва, музыка і г. д.; некаторае праўда, нявыстарчальнае наблiжэньне мастацтва ў асаблівасьці мастацкай літаратуры, тэатру да задач сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама ўзросшы ўдзел шырокіх працоўных мас у будаўніцтве пралетарскага мастацтва БССР, атрымаўшы сваё выяўленьне як у закліку ударнікаў рабочых і калгасьнікаў у літаратуру, так і ў той вялізарнай узрастаючай зацікаўленасьці шырокіх працоўных мас да беларускай літаратуры, тэатру і г. д.

Адначасова пленум катэгарычна падкрэсьлівае, што тэмпы перабудовы работы ў галіне мастацтва адстаюць яшчэ ад запатрабаваньняў цяперашняга этапу сацыялістычнага будаўніцтва».

ЦК КП(б), такім чынам, ужо ў сакавіку м-цы, падводзячы вынікі дасягненьняў, завастрае ўвагу на неабходнасьці ўзьняць тэмпы перабудовы работы ў галіне мастацтва. Гэтая дырэктыва пленуму ЦК КП(б)Б застаецца ва ўсёй сваёй сіле і зараз. Мы павінны катэгарычна патрабаваць бальшавіцкага разгортваньня перабудовы па ўсім фронце.

Выступаючы на памянёным пленуме ЦК КП(б)Б сакратар ЦК тав. Жаброўскі ахарактарызаваў становішча нашай літаратуры і вызначыў яе асноўныя задачы у наступных словах:

«Мы маем буйныя дасягненьні ў галіне разьвіцьця беларускай пралетарскай літаратуры і беларускага тэатру. Гэтыя дасягненьні—колькасныя і якасныя—бясспрэчны. У прыватнасьці мы маем шэраг сур'ёзных зрухаў у наш бок у творчасьці спадарожнікаў (Чорны, Крапіва, Глебка, ды інш.). Мы маем значны рост нашага пралетарскага маладняка, які выходзіць на перадавыя пазыцыі беларускай літаратуры. Расьце паэт тав. Александровіч... Расьце якасьць літаратурнай прадукцыі Лынькова, Галавача, яўрэйскага пісьменьніка Харыка. У наяўнасьці буйныя дасягненьні па лініі закліку ўдарнікаў у літаратуру. Мы выяўляем новыя ўзрастаючыя парасткі пралетарскіх пісьменьнікаў з асяродзьдзя рабочых прадпрыемстваў (Нортман, Швэйдэль, Шаўцоў, Камянецкі, Малашэнка, ды інш.)».

«Ня гледзячы на гэтыя буйнейшыя дасягненьні, мы ўсё яшчэ маем значнае адставаньне мастацкай літаратуры ад тэмпаў нашай вялізарнай сацыялістычнай будоўлі,—тэматыка ўсё яшчэ вузкая, не дасягае ідэёва-мастацкіх вышынь, недастаткова дасягае разуменьня і ўсьведамленьня працэсаў, якія адбываюцца ў савецкай краіне. Неабходна абкружыць максымальнай увагай і дапамогай кадры нашых літаратараў і пісьменьнікаў. Неабходна ва ўсю шырыню паставіць перад імі праблему стварэньня буйных твораў, вартых вялікай эпохі будаўніцтва сацыялізму. Нашы пралетарскія пісьменьнікі павінны, кажучы словамі таварыша Леніна, вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца, ачышчацца ад налету правінцыяльнай абмежаванасьці, вузасьці, якая ёсьць у нашай беларускай літаратуры».

І далей—пра нашу крытыку і пра перабудову літаратурных арганізацый:

«На фронт літаратурнай марксысцкай крытыкі трэба зьвярнуць выключную сур'ёзную ўвагу, забясьпечыўшы яе вытрыманымі сіламі, здольнымі праводзіць глыбокую выхаваўчую работу з пісьменьнікамі.

Неабходна разгарнуць рашучую перабудову работы нашых літаратурных арганізацый, якая-б забясьпечыла большае разгортваньне самакрытыкі, ліквідацыю элемэнтаў групаўшчыны і замкнутасьці. Неабходна пасіліць работу і ўвагу ўсіх пісьменьнікаў і мастакоў, якія падыходзяць ці падыйшлі ўсутыч у сваей творчасьці да стварэньня твораў, якія адлюстроўваюць праблему сацыялістычнага будаўніцтва».

Тав. Жаброўскі у гэтых абзацах прад'явіў нашай літартуры рахунак партыі. Трэба сказаць, што гэты рахунак павольна, зусім нездавальняюча аплачваецца нашай савецкай літаратурай. У нашай рабоце няма яшчэ патрэбных тэмпаў, неабходнай масавасьці, неабходнай апэратыўнасьці і чуткасьці, неабходнай чуласьці да запатрабаваньняў кадраў літаратуры, неабходнай марксысцка-ленінскай вучобы, што зьяўляецца асабліва важным пры тым узроўні, на якім знаходзяцца нашыя кадры літаратуры і мастацтва.

І для таго, каб зжыць гэтыя сур'ёзнейшыя недахопы і прарывы ў рабоце неабходна мацней зьлітаваць кадры савецкіх пісьменьнікаў вакол партыі, зжыць рэшткі групаўшчыны і сямейнасьці, якія яшчэ маюць месца ў шэрагу выпадкаў, бязьлітасна выкараніць келейнасьць і адарванасьць ад мас, выкараніць «масабаязьнь» і шырака разгарнуць бальшавіцкую крытыку і самакрытыку. Усялякае выступленьне таварышоў з паказаньнем на прарывы, якія ёсьць у рабоце, выступленьне, якое сапраўды накіравана на выпраўленьне памылкі і якое сыгналізуе небясьпеку, павінна атрымаць адпаведнае рэагаваньне. Шырокае разгортваньне крытыкі і самакрытыкі, пры сапраўды жывой, энэргічнай рабоце Аргкамітэту, зьяўляецца лепшым прафіляктычным мэтадам барацьбы супроць перагібаў і перасольваньня — абязумоўна шкодных, бо яны, гэтыя перагібы, льлюць ваду на млын клясавага ворага, могуць адкрываць лазейку для «трэцяй сілы» варожай ным [illegible]

Нашым арганізацыям, і Аргкамітэту ССП у першую чаргу, неабходна крута павярнуцца да канкрэтных задач дня. Творчая дыскусія, разгорнутае сур'ёзнае абмеркаваньне творчасьці паасобных пісьменьнікаў, творчыя групоўкі, пытаньні масавай работы, пытаньні быту і забесьпечаньня, задачы уцягненьня рабочых-ударнікаў у літаратуру і кансультацыя іх работы на пэрыфэрыі, стан нашых выданьняў, пытаньні выдавецтва і ганарару і г. д.,—усё гэта павінна знайсьці адлюстраваньне ў рабоце Аргкамітэту, як задачы барацьбы за ажыцьцяўленьне лініі партыі у літаратуры. Для гэтага патрабуецца арганізаванасьць, сыстэматычнасьць, бальшавіцкі стыль у рабоце Аргкамітэту. Трэба стварыць такую працоўную атмасфэру, пры якой усе кадры савецкіх пісьменьнікаў працавалі-б на карысьць сацыялізму.

Ва ўмовах нашай работы асабліва сур'ёзнае значэньне маюць пытаньні стварэньня неабходных умоў для творчасьці пісьменьнікаў. Гэта патрабуе цэлага шэрагу мерапрыемстваў матэр'яльна-бытавога парадку. Штокольвек у гэтай галіне зроблена, але далёка ня вычарпаны ўсе магчымасьці, якія ў нас ёсьць.

Змагаючыся з тэндэнцыямі ўраўнілаўскага падыходу да пісьменьнікаў, неабходна разам з гэтым стварыць такое становішча, пры якім-бы ня было месца замоўчваньня тых ці іншых савецкіх пісьменьнікаў з-за групавых меркаваньняў. Трэба зжыць рэшткі сыстэмы «ярлыкоў», пры якой пісьменьнік зусім мэханічна залічаўся ў той ці іншы лагер. А гэта патрабуе таксама большай увагі да нашай літаратурнай крытыкі, да выяўленьня новых сіл на гэтым вучастку, да ажыцьцяўленьня работы інстытуту асьпірантуры БАН і сувязі яго з канкрэтнай літаратурнай работай, стварэньня кадраў рабочых крытыкаў і г. д. Мы павінны мець такую бальшавіцкую літаратурную крытыку, якая не аглушае, не вульгарызуе, а выхоўвае, якая дапамагае ўзрошчваць, заахвочваць сапраўдныя таленты, крытыку, якая выконвае гэтыя задачы побач з упартай барацьбой на два фронты за ленінскія прынцыпы, супраць спроб пранікненьня клясавага ворага на гэтым фронце, супраць змазваньня антыленінскіх установак, супраць памылковых РАПП-белапаўскіх установак, супраць амністыроўкі ўстановак і г. д.

У гутарцы з савецкімі пісьменьнікамі **тав. Жаброўскі** даў шэраг указаньняў для нашай далейшай работы ў галіне літаратуры. Выкананьне гэтых указаньняў забясьпечвае нам далейшыя посьпехі ў галіне літаратуры і мастацтва.

«Будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў шэрагу вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва яскрава праяўляецца і на ідэалёгічным культурным фронце—як у форме супрацьдзеяньня разгортваньню нацыянальна-культурнага будаўніцтва, так асабліва і вакол ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі» (сакавіковы пленум ЦК КП(б)Б).

Абвостраная клясавая барацьба патрабуе ўзмацненьня нашай пільнасьці, хто-кольвек схільны думаць, што ў гэтай галіне, у галіне, клясавай барацьбы, у нас ёсьць «зацішша»... Досыць прыглядзецца да сапраўднага становішча рэчаў, каб устанавіць адваротнае. Пра актыўнасьць клясавага ворага на фронце літаратуры і мастацтва сыгналізуюць шэраг вылазак за апошні час правага і «левага» парадку, вылазак вялікадзяржаўнага шавінізму, а таксама беларускага, яўрэйскага і інш. нацыяналізмаў, якія не атрымалі сваечасовага адпору. Трэба ўзмацніць барацьбу на гэтым фронце і перамагчы адносіны недаацэнкі. Пільнасьць і яшчэ раз пільнасьць! Вітаючы пастанову ЦКК УсеКП(б) па справе контррэвалюцыйнай групоўкі Руціна, Галкіна, Іванова ды інш., савецкая пісьменьніцкая грамадзкасьць павінна яшчэ больш з'яднацца вакол ленінскай партыі, яе ЦК і любімага правадыра тав. Сталіна, мабілізуючы ўсе свае сілы супраць клясавага ворага, на барацьбу за будаўніцтва сацыялізму, за літаратуру і мастацтва, вартае эпохі пабудовы сацыялістычнага бясклясавага грамадзтва.

Верасьнёўскі пленум ЦК УсеКК(б) прыняў шэраг пастаноў найактуальнага значэньня, якія выходзяць з таго, што на аснове грандыёзных посьпехаў у разьвіцьці цяжкой індустрыі, мы можам цяпер хутчэй зрушваць наперад і вытворчасьць рэчаў шырокага спажываньня, што мы павінны праз разгортваньне савецкага гандлю ўзмацніць змычку паміж горадам і вёскай. Гэтыя пастановы зьяўляюцца кіраўніцтвам да дзеяньня для ўсёй нашай краіны і павінны выклікаць магутную хвалю актыўнасьці савецкіх пісьменьнікаў і работнікаў мастацтва, павінна паслужыць вялікім стымулам большага ўключэньня пісьменьніка і мастака ў канкрэтную барацьбу пралетарыяту за сацыялізм.

Вышэй тэмпы перабудовы, больш энэргічнай работы, мацней барацьбу з рэшткамі «старых традыцый» дрэнных бакоў рапаўскага руху, мацней барацьбу з апартунізмам і шавінізмам на два франты, супраць групаўшчыны і замкнутасьці, за поўнае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых пастановай ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка, за сапраўдную бальшавіцкую работу па падрыхтоўцы нашай краіны да ўступленьня ў пяцігодку пабудовы сацыялізму!

„Гатоў аддаць жыцьцё за СССР“

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ АНДРЭ ЖЫДА

Апублікаваны ўрыўкі з дзеньніка аднаго з выдатнейшых французскіх пісьменьнікаў—**Андрэ Жыда**. Урыўкі характарызуюць вялізарныя зрухі, якія адбыліся ў колах французскай інтэлігенцыі.

Андрэ Жыд рэзка выступае супроць паклёпніцкіх паведамленьняў буржуазнага друку, якія выдумляе байкі аб «правале пяцігодкі». А Жыд пытае па клёпнікаў:

«Але тады чаго-ж мы баіцеся? Вы ня можаце прымусіць мяне дрыжаць перад пачварай і ў той-жа час даказаць мне, што гэтай пачвары ня існуе. Калі камунізму суджана перамагчы,—гаварылі мне,—дык гэта пазбавіць нас сэнсу жыцьця. Я — заявіў Андрэ Жыд,—пазбавіўся-б сэнсу жыцьця, калі-б камунізм пацярпеў паражэньне».

«Калі патрэбна будзе маё жыцьцё—кажа далей Андрэ Жыд,—каб забясьпечыць перамогу СССР, я-б зараз-жа аддаў, як гэта зрабілі і робяць многія іншыя. Я пішу гэта з усёй шчырасьцю і спакойным разважаньнем, бо я адчуваю вялікую патрэбу пакінуць пасьля сябе сьведчаньне на выпадак, калі сьмерць прышла-б да таго, як мне прадаставіцца магчымасьць выказацца лепш».

Выступленьне Андрэ Жыда якому зараз больш 60 год, зрабіла вялікае ўражаньне ў колах французскай інтэлігенцыі.

Дняпро працуе на сацыялізм



У шэраг сацыялістычнай індустрыі ўступіў Дняпродэс

М. Горкі

Пераможам стыхію прыроды і стыхію мінулага

З глыбокай пашанай, з захапленьнем вітаю тварцоў Днепрабуду. Горача вітаю пралетарыят, гаспадара Саюзу Саветаў, з новай перамогай. Калі зьявілася ідэя Днепрабуду—ныцікі, скептыкі і ворагі пралетарыяту ўсьміхаліся, пацяшалі адзін другога: «Нічога ня выйдзе ў бальшавікоў, не адолець ім сілы Дняпра». Адолелі. Вышла. Дняпро пераможаны, і ад гэтага часу будзе пакорна служыць справе разьвіцьця сацыялістычнай культуры. У чым сэнс гэтай перамогі, апрача яе прамысловага значэньня для нашай краіны? Вялізарная колькасьць энэргіі шпарка цякучай рэчкі бясплодна адыходзіла ў мора, дзе і бяз гэтага вады шмат. Разумна кіруемая праца людзей арганізавала гэтую энэргію і прымусіла яе пладатворна служыць справе абагачэньня нашай зямлі. Разам з гэтым пралетарыят Саюзу Саветаў давёў сам сабе, што няма такой перашкоды, якую-б нельга было адолець, няма мэты, якой-бы ён ня мог дасягнуць. Чым далей, тым усё больш цяжкія задачы наладжваньня гаспадаркі ставіць перад сабой тая частка рабочых і сялян, якая арганізавана ў партыі бальшавікоў, уцалёўвае ў сабе разум 160-мільённай масы насельніцтва Саюзу Саветаў і вядзе яе ад перамогі да перамогі. Вось,—будучай вясной злучацца каналам Белае мора з Балтыйскім. Ужо распачаты работы злучэньня Волгі з Масквой-ракой, Масква-рака стане суднаходнай, сальецца праз Аку зноў з Волгаю, а далей ставіцца задача аддаваць мору як можна меньш прэснай вады, ужываючы яе на абвадненьне засушлівых мясцовасьцяй. Начынаецца работа па абвадненьню заволскіх стэпаў для таго, каб даць краіне новыя мільёны гэктараў зямлі пад пшаніцу. Распачата вывучэньне воднага масыву Севанскага возера, у мэтах абвадненьня Армэніі, Грузіі, Азэрбэйджану.

Я лічу лішнім згадваць пра плян электрафікацыі Сібіру, энэргіі Ангары і лішнім нагадваць пра такія грандыёзныя пабудовы, як Магнітагорск і яму падобныя. Розум арганізаванага пралетарыяту зьмяняе геаграфію Саюзу Саветаў, зьмяняе твар сваёй краіны.

У буржуазных дзяржавах Эўропы і ў ПАЗШ капіталісты,назьбіраўшы дзесяткі мільёнаў беспрацоўных рабочых, б'юць іх, калі яны просяць работы і хлеба. Ні адна з капіталістычных дзяржаў ня мае сілы пачаць у сябе нічога падобнага да таго, што робіць пралетар, гаспадар Саюзу Саветаў, для абагачэньня сваёй зямлі, для ўмацаваньня сваёй улады і разьвіцьця ўплыву свайго на ўвесь сьвет працоўных. Бязсэнсоўнае імкненьне ўласьнікаў да нажывы становіцца ўсё больш яўна шалёнай. Зруйнаваўшы свой працоўны народ, прымушаючы яго здыхаць з голаду, капіталісты займаюцца стварэньнем пляну, як лепш абрабаваць Кітай, як прыдушыць нацыянальна-рэвалюцыйны рух у Індыі і інш. калёніях, як абрабаваць народы Паўднёвай Амэрыкі.

Разам з гэтым яны жывуць у страсе, як-бы не пабіцца адзін з другім. Пабіцца ім хочацца і—страшна. Бо яны прывыклі біцца рукамі пралетарыяту, сіламі рабочых і сялян. Але і тыя і другія пачынаюць разумець, што ўжо няма сэнсу біцца за інтарэсы сваіх ворагаў, за людзей, якія раўнадушна глядзяць, як рабочы ўмірае ад голаду і як ён усё больш уважліва прыглядаецца да працы пралетараў Саюзу Саветаў, пачынае разумець сакрушальную сілу адзінага фронту пралетараў у змаганьні супроць капіталістаў. Няма патрэбы казаць пра тое, што Саюз Саветаў глыбока ненавідзяць капіталісты і што яны надзвычайна хочуць таксама дамовіцца аб стварэньні адзінага фронту супроць пралетарыяту сямі савецкіх сацыялістычных рэспублік. Ужо ня ворыцца, каб яны маглі дагаварыцца пра адзінадушны разбойнічы напад на краіну, дзе будуецца новы сьвет.

Але—усё можа быць, вораг яшчэ моцны. Вораг моцны чалавечай дурасьцю, той дурасьцю, якую ён вякамі забіваў у мазгі працоўнага народу. У Саюзе Саветаў гэтай дурасьці абвешчана бязьлітасная вайна. Дурасьць—гэта такая-ж стыхійная сіла, якой была стыхія Дняпро. Разумна кіруемая праца людзей ператварыла яе у разумную магутную і пладатворную сілу. Сацыялістычна-арганізаваны розум людзей перамагае стыхію і пераможа яе, якая-б ня была ў яе сіла. У нас за пятнаццаць год назьбіралася дастаткова доказаў нязрушнай пераможнай творчай сілы розуму. Сёньня мы сьвяткуем адну з перамог, і яна—пачатак для мноства іх.

Розум лепшы, найбольш энэргічны і актыўны розум працоўнага народу Саюзу Саветаў—у партыі бальшавікоў. На гэтым сьвяце вялікай перамогі мы яшчэ раз пераконваемся, што партыя бальшавікоў найлепшы і наймацнейшы арганізуючы пачатак, што ў працоўнага народу Саюзу Саветаў—добрая, сьветлая галава.

Няхай жыве рабочы і селянін сацыяліст! Няхай жыве партыя бальшавікоў і яе правадыры! Наперад, таварышы, да новых перамог над стыхіямі прыроды і над стыхіяй мінулага.

Прывітаньне т. Сталіна

КІЧКАС

НАЧАЛЬНІКУ ДНЯПРАЎСКАГА БУДАЎНІЦТВА тав. ВІНТЭР,

САКРАТАРУ РАЙПАРТКОМУ тав. ЛЕВЕНЗОН,

СТАРШЫНІ РАЙКОМУ САЮЗУ БУДАЎНІКОЎ тав. БРОЎКО.

Нажаль, не магу выканаць вашу просьбу наконт прыезду на пуск Днепрастанцыі з прычыны немагчымасьці адлучыцца з Масквы па ўмовах работы.

Гарачае прывітаньне і віншаваньне рабочаму калектыву і кіраўнічаму складу Днепрабуду ў сувязі з пасьпяховым завяршэньнем вялікага гістарычнага будаўніцтва.

Моцна цісну руку ўдарнікам Днепрабуду, слаўным героям сацыялістычнага будаўніцтва.

І. СТАЛІН.

Беларускія пісьменьнікі на Дняпродэсе

На адчыненьне Дняпродэсу выяжджала брыгада беларускіх пісьменьнікаў у складзе: Янкі Купалы, Андрэя Александровіча, Міхася Лынькова, Платона Галавача, З. Аксэльрода і Сымона Баранавых.

Пісьменьнікі наведалі таксама Харкаў, дзе былі горача сустрэнуты ўкраінскімі пісьменьнікамі.

Ніжэй мы друкуем ліст гэтай брыгады.

Дарагія таварышы!

Прыносім шчырую братэрскую падзяку Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Украіны і ўсім украінскім пісьменьнікам за выключную прыязьнь і цёплую сустрэчу, аказаную нашай дэлегацыі.

У часе свайго прабываньня на Ўкраіне мы мелі гонар пабыць на ўрачыстым адчыненьні Дняпроўскай Дзяржаўнай Гідраэлектрастанцыі імя Леніна, пабачыць волат індустрыі—Харкаўскі трактарны завод і інш. Мы зьяўляемся сьветкамі вялізарнейшага росквіту Ўкраінскай савецкай культуры, у тым ліку росту і разгортваньня украінскай літаратуры і літаратурнага руху і іншых посьпехаў на фронце культурнае рэвалюцыі Савецкае Украіны.

Нячуваныя здабыткі сацыялістычнай гаспадаркі і культуры Украіны сталі магчымымі толькі пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, пры геройчным намаганьні пралетарыяту і ўсіх працоўных мас краіны.

Кожны крок на савецкай зямлі—гэта мужны і пераможны поступ пралетарыяту ў змаганьні за вялікія ясносты камуністычнай будучыні, за новае чалавецтва.

А там, за межамі—у Заходняй Украіне, Заходняй Беларусі і Польшчы—стогнуць нашы браты—працоўныя, скутыя ланцугамі нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту. Але ня гледзячы на крывавы фашыстоўскі тэрор яны ў геройчным змаганьні пракладаюць шляхі да свайго вызваленьня.

Наш рэвалюцыйны абавязак—мастацкім словам цэмэнтаваць вялікую сацыялістычную будоўлю і дапамагаць нашым братом—што ў капіталістычных краінах—у іхным змаганьні з заклятымі ворагамі працоўнага народу.

Моц нашае культуры, моц нашага мастацкага слова ў вялікай інтэрнацыянальнай пралетарскай еднасьці, якая зьмяце з зямлі ўсе перашкоды на шляху да стварэньня новага сацыялістычнага сьвету.

Няхай-жа жыве інтэрнацыянальная еднасьць [illegible] нацыянальных літаратур!

Няхай жыве шчыльнае яднаньне пісьменьнікаў Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі!


Няхай жыве правадыр і арганізатар пераможнага поступу пралетарыяту—Ленінская Камуністычная Партыя!

ЯНКА КУПАЛА,
МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ,
АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ,
ПЛАТОН ГАЛАВАЧ,
ЗЭЛІК АКСЕЛЬРОД,
СЫМОН БАРАНАВЫХ,

Харкаў
15 кастрычніка 1932 г.

Пісьменьнікі Савецкай Беларусі! Пуск Дняпродэсу яшчэ раз ставіць перад намі ва ўсю шырыню задачу больш поўнага і глыбокага паказу герояў сацыялістычных будняў—змагароў за бясклясавае грамадзтва.

Ліст Максіма Горкага Беларускай Акадэміі Навук



Арыгінал лісту Максіма Горкага

Абраўшы мяне ганаровым акадэмікам, Беларуская Акадэмія Навук зрабіла для мяне высокі і—я гэта ведаю—незаслужаны мною гонар. Не знаходзячы ў маім лексыконе выстарчальна моцных і яркіх слоў падзякі, я адказваю Беларускай Акадэміі Навук паважальным і маўклівым паклонам.

Апрача дачыненьня асабіста да мяне, факт майго абраньня мае, на мой погляд, іншае, больш шырокае значэньне. Беларуская Акадэмія Навук служыць цэнтрам яднаньня беларускай, польскай, яўрэйскай, а таксама латыскай і літоўскай пралетарскіх літаратур, якія ў сваім разьвіцьці абапіраюцца на дасягненьні брацкай культуры рускай і інш. нацыянальнасьцяў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Сэнсам работы сваей Беларуская Акадэмія Навук паказвае правільнасьць ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі, фактам уключэньня ў сваё асяродзьдзе адно з работнікаў культуры СССР даказвае наяўнасьць працэсу культурнага яднаньня ўсіх нацыянальнасьцяў Саюзу Сацыялістычных Рэспублік. Ідучы гэтым шляхам яднаньня, шляхам зьліцьця культурных сіл, мы хутка і зусім натуральна дасягнём такога эфэкту: у нашай краіне кожная з саюзных акадэмій разрастаецца ва ўсесаюзныя акадэміі, ва ўсесаюзныя цэнтры творчых сіл.

Нацыянальныя па форме, сацыялістычныя па мэтанакіраванасьці і зьмесьце культуры беларусаў, палякаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў разьвіваюцца на рубяжы двух сьветаў, на рубяжы фашыстоўскай Польшчы. За гэтай мяжой створанай капіталістамі, якая штучна разлучае пралетарыят, людзі працы жывуць ва ўмовах страшэннага фізычнага і духоўнага гвалту, бесчалавечнага ўціску. Там, за мяжою бязьлітасна прыдушваецца ўсякае праяўленьне руху да волі, да разьвіцьця нацыянальна-культурнага самаўсьведамленьня, там адбываецца гвалтоўная паланізацыя народаў. У Беларусі забясьпечана свабода культурнага росту ўсім яе народнасьцям. Зьяўляючыся фарпостам Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на Захадзе, Беларусь зьяўляецца крыніцай культурна-рэвалюцыйнай энэргіі, што цячэ на Захад у працоўныя масы.

Чаго можна пажадаць арганізаванаму ў партыі пралетарыяту Беларусі, увасабленьню розуму і волі яе працоўнага народу?

Яшчэ больш магутнага і шпаркага разьвіцьця энэргіі, розуму і волі, яшчэ больш моцнага зьліцьця іх у адзіную несакрушальную культурна-творчую сілу.

М. ГОРКІ.

10-X 1932 г.
г. Масква.

Напярэдадні XV Кастрычніка

АЎГ. РАМАНОВІЧ

Да пастаноўкі „Бацькаўшчыны“ у БДзТ-1

Пра пьесу Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына», як літаратурны твор—яшчэ рана таварыць, а тым бардзэй аналізаваць, крытыкаваць, рабіць тыя ці іншыя вынікі, паколькі канчатковая рэдакцыя тэксту знаходзіцца ў аўтара ў працэсе апрацоўкі, мажлівы ўсялякія зьмены, урэзкі, вымаркі і г. д.

Ужо ёсьць першы тэкст, поўнасьцю ўся пьеса—ад першай дзеі да эпілёга і гэты тэкст у асноўным прыняты БДТ-1 да пастаноўкі юбілейнага паказу ў дні сьвята пятнаццатай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Выходзячы з гэтага тэксту і мяркаваньняў аўтара пра пэрспэктывы далейшай работы над ім—мы можам пазнаёміць чытача з рухам работы вакол пастаноўкі «Бацькаўшчыны».

Кузьма Чорны досыць вядомы савецкі белетрыст, аўтар шэрагу значных твораў—«Лявон Бушмар»—аповесьць (БДзВ—1930 г.), «Ідзі-ідзі» раман (часопіс «Узвышша»), «Вясна»—аповесьць (БДзВ—1931 г.) і раману «Бацькаўшчына» (часопіс «Узвышша» за 1931 г.), тэма і пэўная частка матар'ялу з якога выкарыстаны аўтарам у пьесе «Бацькаўшчына»,—фактычна робіць першую сталую спробу, як драматурга. Праўда, ім ужо напісана і рыхтуецца да пастаноўкі адным з нашых тэатраў пьеса «Лета», але капітальную работу над драмай, у якой аўтар ня толькі выкарыстоўвае тэхніку і прыёмы сусьветнай драматургіі, але і сам вырашае і ставіць пэўныя фармальныя праблемы—трэба лічыць пьесу «Бацькаўшчына».

Ужо адзін пералік тэм, што распрацоўваюцца ў пьесе «Бацькаўшчына», а менавіта тэма: бацькаўшчына ў Марксыцкім разуменьні яе, тэма: уласнасьці і паказ этапаў рэвалюцыйнай барацьбы ў гістарычнай пэрспэктыве—ўсё гэта гаворыць за тое, што аўтар паставіў перад сабою шэраг складаных задач, што тэатр, разам з аўтарам, сьвядома бяруць на сябе вялікую адказнасьць за мастацкую выразнасьць інтэрпрэтуемых тэм. Усё гэта ёсьць вынік росту тэатру і драматурга, вынік правільнага разуменьня шырыні і велічы тэй задачы, якая стаіць перад мастацтвам у справе падрыхтоўкі да пятнаццатай гадавіны Кастрычніка.

Кожная з пералічаных тэм магла быць каркасам самастойнай пьесы, але задуманая аўтарам эпапэя пераходзіць праз межы аднэй тэмы. Шырокі паказ гістарычных эпізодаў, ахопленых адрэзкам часу, прыблізна, дваццаць год (1912-13--1932 г.)—шлях людзей воблараў праз этапы гісторыі (перад вайной, мабілізацыя, імпэрыялістычная вайна, падпольная рэвалюцыйная барацьба, эпізоды лютаўскай рэвалюцыі, кангрэс, Кастрычнікавая рэвалюцыя, грамадзянская вайна, партызанскі рух, сучасная Польшча, Заходняя Беларусь, калектывізацыя СССР, і, на рэшце, Зьезд Саветаў)—доўгі шлях, па якім ідуць разьвіваючыся галоўныя гэрои пьесы. Невялічкія шэрыя людзі, батракі, рабочыя, праходзяць складаны шлях клясавай барацьбы, загартоўваюцца ў вагні рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, вырастаюць у магутныя фігуры бальшавікоў на сацыялістычнай будоўлі. Аўтарскі дыяпазон, шырыня ідэёвага размаху, бязумоўна, робяць пьесу «Бацькаўшчына». ня звычайнай пьесай нашага рэпэртуару.

Які небудзь скэптык, прачытаўшы гэты сухі пералік гістарычных этапаў, скажа з кіслай мінай на тварэ—«Ну што тут такога? Гістарычная хроніка і ўсё. Мастацкі пераказ гістарычных падзей у хроналёгічным парадку.»—Не. У тым то і справа, што ў пьесе «Бацькаўшчына» гістарычныя падзеі, этапы рэвалюцыйнай барацьбы мы бачым, як бы праз прызму асноўных дзеючых асоб. Гістарычныя малюнкі ўзьнікаюць, у арганічнай сувязі і ў патрэбе ўдзелу ў іх асноўных персанажаў пьесы, якія праходзяць чырвонай лініяй праз усю суму гэтых падзей, якіх, часам, захлестываюць гэтыя падзеі і носяць, як трэску па хвалях, альбо ў якіх яны самі адыгрываюць кіруючую ролю. Вобраз тут не раз драбляецца ў масе людзей, падзей, зьяў,—ён увесь час разьвіваецца, ён увесь час дзейнічае, змагаецца, як напрыклад—Леапольд Гушка—цэнтральная фігура ў пьесе.

Складаны шлях праходзіць Леапольд Гушка. Пасьля ўпартай барацьбы з самім сабою, са сваімі дзецьмі, з абхапляючым яго асяродзьдзем—прыходзіць ён да аднаўленьня ідэй уласнасьці, да новага разуменьня праблемы бацькаўшчыны—як бацькаўшчыны ўсіх працоўных, незалежна ад нацыянальнасьці і права на зямлю.

Такі асноўны вобраз пьесы «Бацькаўшчына»—Леапольда Гушкі. Але ня толькі ён адзін; і сын яго—Адась Гушка, і дачка—Марыля Гушка, і муж яе Паўла Няміра, і жонка Гушкі, і стары падпольшчык — «малады-стары» прайшоўшы адпаведную школу жыцьця і рэвалюцыйнай барацьбы, добры тактык—Евель Цывін, і стары і малады паны Ёткі, досыць буйныя памешчыкі і фабрыканты, і тыповыя вясковыя кулакі—шляхта Сурвіла і Мазавецкі, і звар'яцеўшы люмпэн-інтэлігент—Сёмка Марэйна, і цэлая галерэя жывых, рэалістычных вобразаў, сакавіта і яскрава намаляваных аўтарам у шырокіх аб'агульненьнях з ім уласьцівою моваю, дзеямі, філязофіяй...

Бязумоўна пьеса «Бацькаўшчына»—пьеса вобразаў, але яна не бракуе і становішчаў—дынамічных, сцэнічна завостраных становішчаў. Шэраг драматычных вузлоў, асабліва сконцэнтраваных у першай дзеі, бязумоўна забясьпечваюць ёй напруджанасьць гледача.

Уласьцівая Кузьму Чорнаму рэалістычная манера пісаньня, мясцамі пераходзіць і хаваецца пад лёгкі імпрэсыоніскі флёр, асабліва ў паказе дзей і асоб, дзеючых у далёкім мінулым. У асноўных жа перамагае здаровы рэвалюцыйны рэалізм, рэльефна выпукляючы ідэолёгію твораў.

Было-б зусім наіўна думаць, што пьеса нават пасьля ўсіх сваіх перапрацовак, паправак, даапрацовак—будзе ўжо крышталёна чыстай ад тых, ці іншых памылак, недаглядаў, непаўнаты, аўтарскага суб'ектывізму і г. д.

Як кажа расійская пагаворка,—«кому много дано, с того много и спросится». А Кузьме Чорнаму «дано много». З яго-ж «много и спросится», гэтаму, што аўдыторыя, якая будзе глядзець яго пьесу—гэта самі ўдзельнікі гэтых падзей, на вачох большасьці адбывалася закранутае ў пьесе, самі гэрои будуць карэктарамі гэрояў пьесы «Бацькаўшчына»—а гэта грозныя судзьдзі, неўмалімыя ў справе сапраўднага адбіцца гэроікі нашай рэчаіснасьці.

Драматург знайшоў свой тэатр.

Ня выпадкова, што Кузьма Чорны зблізіўся ў сваёй працы з БДзТ-1. Асноўная лінія шляху БДТ-1—гэта пошукі рэалізму. Здаровага рэвалюцыйнага рэалізму. Пошукі мастацкіх прыёмаў, якія-б у найбольшай конкрэтнасьці, ачышчаныя ад эстэцкай шалухі і фармалісцкіх конст-штук, даносілі-б да гледача ва ўсёй сваёй філязофскай яснасьці, мастацкай выразнасьці і жыцьцёвай пераконлівасьці—асноўную ідэю твору.

Шлях рэжысэра—А. Міровіча, і зараз Л. Літвінава—гэта шлях пошукаў рэалізму.

Ставіць пьесу мастацкі кіраўнік БДзТ-1—Л. М. Літвінаў.

Пастаноўка гэтая зьяўляецца ня толькі новай этапнай работай тэатру, але яна будзе зьяўляцца фактычна першай сьвядомай дэкларацыяй тэатру ў справе пад'агульненьня вопыту мінулых работ, замацаваньня выпрабаваных найбольш дасканалых прыёмаў яго творчага мэтаду, станаўленьня на цьвёрдыя, прынцыповыя пазыцыі рэалізму.

Няма чаго і гаварыць, што гэтая пастаноўка ставіць перад тэатрам шэраг надзвычайна цікавых задач. Яна адкрывае рэжысэру пастаноўшчыку, мастаку, кампазытару, не гаворучы ўжо аб акторы—шырачэзныя мажлівасьці для самастойнай творчасьці, чагосьці буйнага, грандыёзнага, мануменальнага—як і самы зьмест і форма твору. Але, на жаль, адсталая тэхніка нашай адзінай сцэны (будынак БДзТ-1) слабая мэханізацыя, адсутнасьць адпаведных машын і электро-прыладаў і заўсёдны «Тришкин»—бюджэтны —«кафтан»—не дазваляюць тэатру адпаведным чынам афарміць гэтую пастаноўку. Вялізарная работа праводзіцца ў справе звужваньня пастановачных пляноў—бюджэтам-бы Наркамасьветы ня можа, як сьлед, задаволіць хоць адзін тэатр адпаведным чынам, для таго, каб ён мог стварыць сапраўдную мастацкую каштоўнасьць, да дню пятнаццатай гадавіны Кастрычніка.

У асобе Л. М. Літвінава—аўтара пастановак—«Авечая Крыніца» «Джым Купэркоп», «Паэмы пра сякеры» (БДзЯТ), «Плянцарм» (БДзТ-1),—пьеса «Бацькаўшчына» знайшла свайго адпаведнага пастаноўшчыка. Добры аналітык, багаты эрудыт, чалавек ня вычарпанай творчай фантазіі,ён па майстэрску раскрывае схаваныя за скупымі аўтарскімі рэмаркамі шырачэзныя прасторы недапісанага тэксту, ён сам творыць новыя і новыя эпізоды, пашыраючы дыяпазон твору, ён дае адпраўныя пункты, па якім актор павінен панесьці свае клясавыя адносіны праз вобраз да сацыяльнай задачы паказу.

Літвінаў бачыць у пьесе «Бацькаўшчына» гэроічную эпапею рэвалюцыйнай барацьбы, паказаную праз прызму разьвіваючыхся вобразаў. Адсюль яго плян патэтычнага паказу на маленькім месцы вялікіх эпізодаў, характарызуючых Кастрычнік. Беручы за аснову шуканьне рэалістычных прыёмаў, ён аднак, не замыкаецца ў вузкія рамкі псыхалёгіі паасобных гэрояў, а раскрывае панараму здарэньняў, якія зб'ўмоўліваюць учынкі гэрояў, альбо характарызуюць той, ці іншы гістарычны этап. Адсюль шматплянавасьць месца дзеі. Часам для больш глыбокага паказу сутнасьці таго, ці іншага зьявішча, уводзяцца ў сцэны шэраг асацыятыўных момантаў, шэраг пастановачных прыёмаў, выконваюць задачу найбольш поўнага і усебаковага паказу. (інтармэдыі, пантоміны, музыка і г. д.).

Мастацкае афармленьне выконвае мастак Рабічаў—аўтар цікавага афармленьня да пьесы «ЛЕН». Музыку піша кампазытар Цікоцкі—аўтар таленавітай музыкі да пьесы «Плянцарм», перад ім пастаўлена задача шырока выкарыстаць фольклер беларускай народнай музыкі, яе дэмократычныя элемэнты.

У пьесе заняты ўвесь акторскі склад тэатру.

Мы вельмі сьцісла спыніліся на разгорнутай працы па падрыхтоўцы пастаноўкі «Бацькаўшчыны». Цяпер не адменная справа самой грамадзкасьці сачыць за работай тэатру, дапамагаць яму ў яго адказнай рабоце, на якую кінуты лепшыя сілы мастацтва, для таго, каб стварыць сапраўдную каштоўнасьць, вартую вялікай гадавіны.

„Чужаземная калегія“ у Яўдзяржтэатры

Дзяржаўны **Яўрэйскі** Тэатр БССР рыхтуе да кастрычніцкай гадавіны новую п'есу «Чужаземная калегія», напісаную пісьменьнікам Львом Славіным. П'еса малюе адзін з участкаў грамадзянскай вайны—французскую інтэрвенцыю ў 1919 годзе. Дзея адбываецца ў Адэсе. Паказаны прыход акупантаў, праца падпольнай бальшавіцкай арганізацыі ў шэрагах французскай арміі, разлажэньне акупанцкай арміі і рост у яе шэрагах пралетарскай салідарнасьці і завяршэньне п'есы—адыход французскай арміі з савецкай тэрыторыі.

Гэта—асноўны стрыжань п'есы. Раўналежна з гэтым паказваецца гісторыя правалу і гібель «чужаземнай калегіі», г. зн., групы падпольных бальшавікоў, што працавалі сярод французскіх салдат і матросаў. Тэма і сюжэт рэчы маюць багаты жанравы матар'ял, што дужа тонка перадае быт і калёрыт Адэсы тых дзён. Рэч напісана аўтарам у пляне трагікамэдыі, у ёй дужа шмат завостраных вобразаў і палажэньняў, даведзеных да гратэску. Агульны тон п'есы—радасны, бадзёры—ня гледзячы на трагічнасьць канфліктаў. П'еса перакладзена на яўрэйскую мову пісьменьнікам **А. Д. Кушняровым.** Ставіць спэктакль рэжысэр **Б. Норд.** Мастакі спэктаклю **—Г. Філіпоўскі і Л. Зевін,** кампазытар **—Ул. Крукаў,** харэограф**—Е. Вульф.**

У наступным нумары нашай газэты будзе зьмешчана гутарка з пастаноўшчыкам «Чужаземнай калегіі» тав. Б. Нордам.

Кампазытары--Кастрычніку

Беларускія кампазытары дзейна рыхтуюцца сустрэць XV гадавіну Кастрычніка.

Напісаны цэлы шэраг буйных твораў, прысьвечаных вялікай гадавіне. Зусім закончаны напісаньнем наступныя творы: сымфанічны твор (уверту ра) «Зары насустрэч» Аладава, кантата (хор з аркэстрам) і фуга («Сталін буд») Равенскага, урачысты сымфанічны твор «Новы шлях» Шнілмана «Гімн кастрычніку» (хор з польскім тэкстам) Яфімава, «Аўрал» (хор з сольлю на тэму абароны БССР) Палонскага, марш для духавога аркэстру Іванова. Таксама пішуцца творы кампазытарамі Мадісонам і Сакалоўскім.

Выстаўка друку нацыянальнасьцяй ўсяго сьвету

пэрыядычны друк на 205 мовах

Да XV гадавіны Кастрычніка ў Тыфлісе адчыняецца выстаўка друку нацыянальнасьцяй усяго сьвету—найвялікая ў гісторыі выстаўка, у сем разоў большая па памерах за міжнародную выстаўку ў Кельне ў 1928 годзе. У гэтым годзе будзе функцыянаваць першая частка выстаўкі—84 вітрыны. Адчыняецца дванаццаць аддзелаў: гісторыя газэты наогул, гісторыя газэты ў Расіі, гісторыя бальшавіцкага друку, савецкі нацыянальны друк на 75 мовах, вынікі нацпалітыкі, камуністычны друк сьвету, нацыянальна-рэвалюцыйны друк прыгнечаных народаў, друк самых малых народаў сьвету, друк СССР да XV гадавіны кастрычніка, друк ЗСФСР (раней і цяпер), друк Грузіі.

На выстаўцы прадстаўлены пэрыядычны друк 282 краін на 205 мовах сьвету. Самай старой газэце—363 гады.

Асабліва багатая выстаўка газэтамі і часопісамі каленіяльных краін.

Гісторыя бальшавіцкага друку пачынаецца «Новай Рэйнскай газэтай» Карла Маркса ў 1849 годзе і канчаецца кастрычнікам 1917 году.

Самым асноўным аддзелам зьяўляецца аддзел «Вынікі нацпалітыкі», дзе выведзены характэрныя параўнаньні, што паказваюць, напрыклад, як культурная Ірляндыя на шмат адстала ад нядаўна мала культурнай Юга-Асэтыі.

Усю выстаўку цалкам мяркуецца разгарнуць у 1934 годзе. На выстаўку чакаецца прыбыцьцё вялікай колькасьці чужаземных турыстаў.

Наркамасьветы Грузіі адкрыў вышэйшыя спэцыяльныя курсы па падрыхтоўцы работнікаў выстаўкі; у 1933 годзе пры выстаўцы пачынае функцыянаваць навукова-дасьледчы інстытут друку і пісьменнасьці нацыянальнасьцяй усяго сьвету.

Старшынёй камітэту выстаўкі зьяўляецца таварыш Філіп Макагадзэ—старшыня ЦВК ЗСФСР намесьнік старшыні—тав. Берыя—наркамасьветы Грузіі.



Менск у Кастрычніку. Трыбуна на пляцы волі.

Кастрычнікаўскі нумар нашай газэты

Рэдакцыя газэты «Літаратура і Мастацтва» склікала нараду літаратуразнаўцаў, крытыкаў і пісьменьнікаў па пытаньню падрыхтоўкі да кастрычніка. Нарада адбылася 12-га гэтага месяца.

На нарадзе шырока абмяркоўвалася пытаньне выданьня кастрычнікаўскага нумару газэты «Літаратура і Мастацтва». Пасьля ўступнага слова тав. Дунца ў спрэчках выказаліся Гурскі, Куніцкі, Барашка, Чорны, Кучар, Бядуля, Мікуліч.

Пісьменьнікі і крытыкі, што прысутнічалі на нарадзе, абавязаліся даць матарыял для гэтага сьвяточнага нумару.

Трэба заўважыць, што ўзятыя пісьменьнікамі і крытыкамі самаабавязацельствы, па напісаньню артыкулаў да вялікай гадавіны, пра якія мы пісалі ў папярэднім нумары нашай газэты, да гэтага часу ня выкананы.

Белдзяржансамбль запрошаны ў Маскву

На кастрычнікаўскія сьвяты ў Маскве адбудуцца ўрачыстыя вечары народаў СССР, прысьвечаныя XV гадавіне Кастрычніка. Ад БССР прыме ўдзел Беларускі Дзяржаўны Ансамбль народных інструмантаў пад кіраўніцтвам Жыдовіча з удзелам сьпевакоў Александроўскай, Андруковіча і Дзянісава. Ансамбль рыхтуе для гэтых канцэртаў новы рэпэртуар, галоўным чынам, беларускія народныя песьні апошніх запісаў. Рэпэртуар рыхтуецца пры ўдзеле і кансультацыях кампазытара Любана.

Усесаюзная нарада па маладзежнай і дзіцячай кнізе

ЦК УсеЛКСМ ухваліў склікаць 1-га лістапада 1932 году ўсесаюзную нараду па маладзёжнай і дзіцячай кнізе. На гэтай нарадзе будуць абмяркованы даклады украінскага выдавецтва «Малады бальшавік» і юнсэктараў дзяржаўных выдавецтваў Беларусі, Азэрбэйджану, Грузіі і Узбэкістану па пытаньнях вынікаў выданьня юнацкай і дзіцячай кнігі ў 1932 годзе і пра пляны выдананьня на 1933 год, а так сама будзе заслухана паведамленьне загадчыка выдавецтвам ЦК УсеЛКСМ «Маладая гвардыя» тав. Троцкага пра папярэдні плян выдавецтва «Маладая гвардыя» на 1933 год. Для папярэдняга азнаямленьня з работай мясцовых выдавецтваў у Харкаў, Тыфліс, Ташкент і Менск камандыруюцца брыгады, што камплектуюцца ЦК УсеЛКСМ і выдавецтвам «Маладая Гвардыя». На нарадзе будуць заслуханы садаклады гэтых брыгад.

На нарадзе будуць створаны дзьве сэкцыі: першая—па пытаньню выданьня грамадзка-палітычнай літаратуры для моладзі і другая—па пытаньню выданьня дзіцячай кнігі.

Да нарады выдавецтвам «Маладая гвардыя» будзе арганізавана выстаўка юнацкай і дзіцячай кнігі.

Творчая паездка

Пісьменьнік Васіль Сташэўскі на працягу 2-х месяцаў аб'яжджае месцы работ геалёгаразьведачных партый атрадаў, экспэдыцый.

Ён пазнаёміўся з работамі сапрапэлевай экспэдыцыі Ўсесаюзнай Акадэміі Навук, партыямі паўночнай базы Белгеаразьведкі. Пабываў у Зьвянчатцы, на Іванаўскіх трапельных руднях, Бахраўскіх фасфарытных руднях. Пазнаёміўся з работаю геафізычнай групы магнітамэрыя). Зараз выехаў на поўдзень БССР для азнаямленьня з разьведкаю гранітаў.

У выніку ім напісана шэраг карэспандэнцый і нарысаў у цэнтральную і раённую прэсу, у часопісі.

Белгеаразьведка мяркуе выдаць зборнік яго нарысаў.

Матарыял, які зьбірае В. Сташэўскі, будзе выкарыстаны ім у аповесьці.

Зрабіць круты пералом

Тое, што, гаворачы пра масава-літаратурны рух на Беларусі, цяжка апэраваць статыстычным матар'ялам, зьяўляецца паказьнікам неарганізаванасьці, неаформленасьці, расплыўчатасьці гэтага руху.

Час-ад-часу ў «ЛІМ'е» зьяўляюцца допісы, лісты з месц, якія сыгналізуюць пра слабасьць, а то і поўны развал літработы. Досыць часта паштавік прыносіць у Дом Пісьменьніка лісты з далёкіх вёсак, мястэчак, у якіх таварышы—аргнізатары мясцовых літгурткоў—просяць парады, як ім працаваць, просяць трымаць з імі сувязь; пытаюцца, галоўным чынам, пра праграмы, наогул, пра падручнікі для літработы.

Не разабраўшыся ў справе, не жадаючы прааналізаваць становішча з тым, каб знайсьці хібы і нахаду выправіць іх, некаторыя пад сьвежым уражаньнем няпрыемных фактаў, упадаюць у паніку і горача ківаюць галавой:

— Літгурткі—гэта фікцыя!

і дадаюць:

— Ва ўсім гэты Аргкамітэт вінаваты!

Людзей, якія шалеюць у паніцы, трэба біць фактамі, каб яны ачухаліся. А факты гэткія:

Ня фіктыўна, а сапраўды, заклік ударнікаў на Беларусі пачаўся у нас прыблізна год таму назад, пасьля канфэрэнцыі Менскай АПП. Пачынаючы з гэтай канфэрэнцыі, якая мела тады усебеларускае значэньне, па аднаму толькі Менску, замацавалася і працавала ў зімовы пэрыяд каля пятнаццаці гурткоў. Выпушчаны да канфэрэнцыі зборнік рабочых ударнікаў, які ў пяршыню сабраў і паказаў грамадзкасьці творчы актыў літгурткоўцаў. Праўда, у другім зборніку (яшчэ ня вышаў з друку) колькасьць зьменшылася. На працягу зімы выкрышталізавалася група таварышоў, як са складу аўтароў першага зборніка, так і з ўноў закліканых у літаратуру, літпрадукцыя гаворыць за тое, што гэта група ў асноўным замацуецца ў літаратуры.

Таварышы (Бацюшкоў, Шаўцоў і інш.) узяліся за ўпартую творчую вучобу, і нам трэба толькі вітаць гэта. Хопіць танных, няшчырых захапленьняў гэткімі кніжкамі, як: «Новы цэх варашылаўцаў». Крытыка павінна патрабаваць ад ўдарніка мастацкай дабраякаснай кніжкі. І ударнік здолен яе даць. А для таго, каб мець права патрабаваць, мы павінны стварыць творчыя магчымасьці ўдарніку. Яны—у наладжваньні яго вучобы.

У гэтых адносінах вопыт Менску—адмоўны. Дэкадныя нарады творчага актыву ўдарнікаў пры Доме Пісьменьніка ні ў якай меры не задавальнялі гэтай патрэбы. Працуючы бяз усякага пляну, па аднаму шаблёну (абмеркаваньне творчасьці прыстунічаўшых) не ахопліваючы нават усяго актыву, творчыя нарады адыгрывалі вельмі малую ролю.

Акрамя асобных пісьменьнікаў—камсамольцаў, нарады з боку пісьменьніцкага актыву не наведваліся. Дапамогі ад большасьці пісьменьнікаў яны не атрымалі.

Можа патрэба ў вучобе задавальняла гурткі? — Не, нездавальняла. Без праграм, цалкам залежачы ад кіраўнікоў, часта нехваліфікаваных у літаратурнай справе, бяз удзелу пісьменьніцкага актыву, большасьць літгурткоў трымалася толькі энэргіяй асобных літгурткоўцаў, кіраўнікі, за невялікім выключаньнем, да заняткаў ня рыхтаваліся, выкладалі літаратурную хроніку, праводзілі надакучыўшыя таварышом чыткі. Пра які небудзь пэдагагічны падыход, каб зацікавіць гурток тэмай заняткаў і гаварыць няма чаго.

Шмат выпадкаў было і такіх, што гурток зьбіраўся, чакаў кіраўніка, а потым разыходзіўся. Кіраўнікі адносіліся да справы па-абыватэльску займацца з гуртком, ім што лямку цягнуць.

Але былі выпадкі другога характару: кіраўнік прыходзіў на гурток не дачакаўшыся нікога, заварочваў назад. Выклікалася гэта няцікавасьцю літгурткоўцаў, якія пасьля некалькіх заняткаў бачылі, што ніякай асаблівай карысьці, ці хоць бы прыемнасьці ад гуртка няма. Кожны цэніць цяпер свой час і губляць яго на справу, жыцьцёвасьць якой не даказана, ня будзе.

Аднак у яшчэ большай меры гэта выклікалася тым, што ні прафсаюзныя, ні камсамольскія арганізацыі ніяк ня кіравалі, не дапамагалі гурткам, а часам проста перашкаджалі, не адводзілі часу для зняткаў, не давалі памяшканьня, нагружалі літгуртко́ўцаў, бяз уліку таго, што работа ў літгуртку—нагрузка.

Вынікам, галоўным чынам, такіх адносін да гурткоў, зьявіўся поўны развал, спыненьне ўсякай работы іх улетку. Вынікам такіх адносін зьяўляецца тое, што цяпер праца гурткоў аднаўляецца з вельмі вялікімі цяжкасьцямі.

Пасьля летняга прыпынку прышлося сустрэцца з такім становішчам, што амаль увесь творчы актыў ударнікаў, на якім гурткі трымаліся, пашоў на вучобу. Астатнія-ж ня могуць забыць мінулы год і таму асаблівага захапленьня ў іх не наглядаецца. Аднаўленьне работы кожнага літгуртка дзецца цяпер з такімі цяжкасьцямі, што наўрад ці некаторыя людзі, якія любяць «тэарытычна» разважаць, уяўляюць сабе гэта.

Менскі ГК ЛКСМБ аказаў Аргкамітэту ССПБ практычную дапамогу (у правядзеньні зьлёту і інш. (Праўда, камсамольскія калектывы гораду яшчэ слаба адгукнуліся, яны яшчэ не зьяўляюцца дапаможнікамі, арганізатарамі літартурнае справы на сваіх прадпрыемствах. Куды варта такое становішча, калі на заводзе імя Варашылава на працягу двух месяцаў, сакратар культпропу камсамольскага калектыву ўсё яшчэ ня можа выбраць часу для збору літгуртка.

Калі камсмол хоць мала ды робіць, дык пра прафсаюзныя арганізацыі ня ведама што і гаварыць.

Пачынаючы з ЦСПСБ, які масавы літаратурны рух ня ўключыў у плян сваёй дзейнасьці Менскі Гарпрафсавет—работнік якога—Ермалкевіч—на ўсе звароты да яго адказнае, што часу няма на такую справу, канчаючы фабзаўкомамі, што, раўняючыся «па начальству» таксама нічога ня робяць. Былы культработнік заводу Варашылава—Райцэс (цяпер з работы зьняты) адмахваўся тым, што акрамя літгуртка ў яго галава іншымі справамі занята. Культрботнік абутковай фабрыкі—**Лук'ян** цешыцца тым, што раз на іншых прадпрыёмствах літгурткі ня наладжаны, дык яму сам гасподзь бог казаў гэтым не займацца.

За апошні час па шэрагу гурткоў Менску (Варашылава, Камунар, Молатава і інш.) зрываюцца заняткі. Ня гледзячы на тое, што **кіраунікамі гурткі ўкамплектованы.** Тлумачыцца гэта тым, што з боку грамадзкіх арганізацый прадпрыемстваў увага да літгуртко́ў слабая. А часам яе і зусім няма.

Атрымаліся своеасаблівыя «нажніцы»: сродкі і энэргія ўкладзеныя аргкамітэтам **ССПБ для разьвіцьця масавага літаратурнага руху, далёка не прапарцыянальны маючымся вынікам.**

Трэба пазбыцца гэтых «нажніц», так нельга далей працаваць. Тэрмінова трэба правесьці наступнае:

Падабраць шмат кваліфікаваных кіраўнікоў, маючых жаданьне прадаваць.

Прыцягнуць да кіраўніцтва мясцовае настаўніцтва (асабліва гэта важна для мястэчак і вёсак);

Для забесьпячэньня дзейнай творчай вучобы ў гуртках, прымацаваць паасобных пісьменьнікаў.

Ускласьці поўную адказнасьць за арганізацыйны бок справы на камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі.

Стварыць пры Менскім Доме Пісьменьніка ў найхутчэйшы тэрмін цэнтральны габінэт ударніка, які-б вёў усю кансультацыйную і наогул вучэбную работу з літгурткамі Беларусі.

Праграмы для гурткоў, што складаюцца ўсё яшчэ марудымі тэмпамі апублікаваць у бліжэйшыя дні.

Не ўдавацца ў паніку, не культываваць ліквідадарскіх настрояў а зрабіць круты дзелавы пералом—вось што мы павінны мець у масавым літаратурным руху Беларусі да кастрычніцкіх сьвят і ўсебеларускага зьезду Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі.

П. Шбэйдэль.

За юнацкі тэатр!

Ня гледзячы на шэраг памылак, трамрух мае вялікія дасягненьні. Але дзякуючы адсутнічаньню апэрацыйнага кіраўніцтва з боку цэнтральнага трамсавету, дасягненьні ня былі сыстэматызаваны, ня было цеснай сувязі паміж ТРАМ'амі і ў выніку гэтага ня было абмену творчым вопытам у практыцы кожнага ТРАМ'у.

Наша эпоха патрабуе ад ТРАМ'у новай мастацкай якасьці — стварыць жывы, дзейны, вясёлы спэктакль. Вось шлях кожнага тэатру. Гэта ўстаноўка патрабуе ліквідаваць недахопы, яна кажа, што цэнтральныя задачы гэтага: барацьба за якасьць прадукцыі, барацьба за марксысцка - ленінскую тэорыю, гэта патрабуе прыцягненьня лепшых сіл прафэсыянальнага тэатру, гэта патрабуе грунтоўнага вывучыць і крытычна аўладаць спадчынай, гэта патрабуе пакончыць з цэхаўшчынай і замкнёнасьцю.

Што мы мелі ў Беларусі? У Беларусі, як і ў іншых рэспубліках, ТРАМ'ы мелі шэраг памылак. Беларускі ТРАМ, асабліва ў час яго першай пастаноўкі «Першы штандар» меў цэлы шэраг недахопаў—схэматызм, адсутнічаньне асновы (фабулы), «героя дню» (дзейнічала суцэльная маса).

З Пастаноўкай «Новы горад» (аўтар Гурскі) ТРАМ ліквідаваў шэраг недахопаў, але тут яшчэ пануе схэматызм, тут вы яшчэ ня маеце жывога вобразу.

Адным з вялізарнейшых дасягненьняў калектыву і яго мастацкага кіраўніцтва гэта тое, што ўся ўвага зьвернута на актора, і гэтым БелТРАМ паказаў, што ён мае вялікую мажлівасьць для далейшага росту, што ён у асноўным складае добры творчы калектыў.

Цэнтральны яўрэйскі ТРАМ сваёй першай пастаноўкай «Фронт» ліквідаваў шэраг недахопаў, але таксама не перамог момантаў схэматызму. (Гомельскі яўрэйскі ТРАМ — «Зайдэнэр газ»).

Трамрух за апошні час аслабеў. У 1932 годзе ТРАМ за адсутнічаньнем мінімальных умоў для працы пачаў раскідацца. Гомельскі ТРАМ першым прарабіў «этап развалу». І толькі тады, як ён дасягнуў паўнейшага развалу, ім зацікавіліся.

ЦСПСБ адпусьціў на трамаўскі рух 19 тысяч рублёў. Гэтым і абмяжаваўся, ніякага кіраўніцтва трамаўскім рухам ня было. Асаблівую ўвагу мы павінны зьвярнуць на адносіны шэрагу камсамольскіх арганізацый, якія думалі і думаюць, што ТРАМ—гэта апошняе зьвяно камсамольскай работы. Таму сувязь камсамолу з ТРАМ'амі была досыць слабая, яна не забясьпечыла творчага росту.

На сёнешні дзень яўТРАМ зусім спыніў сваю работу. Пастанова ЦК ЛКСМБ пра злучэньне гомельскага і менскага ТРАМ-аў дае магчымасьць стварыць базу для далейшага разьвіцьця, гэта значыць, пачаць работу замацаваньня трамфронту. ТРАМ ня зможа ажыцьцявіць задачы, што стаяць перад ім, калі ня прыдуць на дапамогу спэцыялісты прафэсыянальнага тэатру. Таму мы зьвяртаемся да яўрдзяржтэатру дапамагчы нам канкрэтна ў нашай рабоце. Тэатр можа дапамагчы нам вылучэньнем выкладчыкаў, рэжысораў.

Арганізацыя савецкіх пісьменьнікаў можа ня менш дапамагчы нам, як і яўрэйскі дзяржаўны тэатр. Пытаньне рэпэртуару досыць складанае. ТРАМ яго не разьвяжа без дапамогі нашых драматургаў і пісьменьнікаў.

Трэба дапамагчы нам у штодзённай рабоце.

Х Лапідус.

Горад Менск у дні Кастрычніка

Мастацкае афармленьне мяняе год за годам свой твар, паступова, з ростам эканамічнай магутнасьці краіны, з ростам культурнага ўзроўню працоўных, з ростам тэмпаў нашага будаўніцтва, усё мацней і мацней гучаць у афармленьнях матывы посьпехаў пралетарскай дзяржавы, матывы баявога энтузіязму працоўных, што будуюць пад кіраўніцтвам партыі сацыялізм.



Менск у Кастрычніку. Арка.

Перад мастаком пачынаюць высоўвацца складаныя і адказнейшыя задачы: стварыць афармленьне, адпавядаючае зьместу і патрабаваньню пралетарскіх сьвят.

Тэхніка афармленьня да масавых сьвят з ростам новай савецкай тэматыкі, таксама надзвычайна ўзрасла і ўскладнілася. Афармленьне гораду патрабуе мабілізацыі арміі мастакоў і дапаможнай тэхнічнай сілы. Складанасьць тэхнікі афармленьня, гораду, са старой, неарганізаванай архітэктурай, цяжка паддаецца афармленьню, нязначная колькасьць кадраў спэцыялістаў па мастацкаму афармленьню масавых кампаній, усё гэта ставіць пытаньне пра плянавасьць працы, пра ўнясеньне прынцыпаў і прыёмаў афармленьня, пра ўвядзеньне палітычнага і мастацкага кантролю над афармленьнем.

Як-жа ўсё гэта праводзілася пры афармленьні Менску і другіх гарадоў БССР? Трэба проста сказаць, што дрэнна, дрэнна як з боку плянавасьці ўсей працы, так і з боку самых мастацкіх арганізацый і паасобных мастакоў.

Адсутнічаньне агульных пляноў афармленьня, адсутнічаньне агульнага мастацкага кантролю і кіраўніцтва над аздобленьнем будынкаў і установаў, вітрын магазынаў, прадпрыёмстваў і інш. прыводзіла да надзвычайна нявытрыманага, пстракатага, тэматычна ня зьвязанага афармленьня, якое ні ў якім разе не арганізоўвывала і немабілізавала.

Першамайскае афармленьне ў гэтым годзе Менску трэба прызнаць надзвычайна няўдалым. Такое становішча ў мінулым не магло ня прымусіць кастрычніцкую гарадзкую камісію падыйсьці да афармленьня больш глыбока і ўдумліва.

Таварыства «Мастак», сваечасова зацьвердзіла брыгаду мастакоў (Станковіч, Алтуф'еў, Сілікава і Тычына), якая распрацавала праэкт афармленьня гораду.

Брыгада азнаёміла паседжаньне мастацкай падкамісіі са сваім плянам афармленьня гораду, які з дадаткамі зацьверджаны камісіяй.

Мастацкая падкамісія дала брыгадзе даволі жорсткі ліміт, як на дэфіцытныя, дэкарацыйныя, так і сьветаэлектрычныя матар'ялы і гэта вызначыла рамкі працы брыгады.

Моманты сьветаплякатаў, кінопраэкцый, рухомых тэкстаў і інш. закрануты вельмі скупа, але ў параўнаньні з мінулымі гадамі афармленьне задумана грандыёзна. Цэлы шэраг такіх момантаў, як аб'ёмная рухомая ўстаноўка, рухомыя сьветатэксты, сьветавы плякат, кінапраэкцыя, асьвятленьне пляцоў і вуліц пражэктарамі, прымяненьне рухомых карыкатур ужо прапрацавана і зацьверджана да выкананьня. Тэматычнае афармленьне ня мае на гэты раз раздробленасьці, а сканцэнтравана на паасобных пунктах гораду.

Цэнтральны пункт—Пляц Волі—афармляецца тэмай «У нас і ў іх» і складаецца з наступных частак: трыбуна, якая пабудована па прынцыпу цеснай сувязі з самім пляцам і дэкарацыяй і разьлічана на магчымасьць тэатралізаванага выступленьня, вялікай архітэктурна-мастацкай ўстаноўкі, акружаючай увесь Пляц Волі, на якой у пляктах будуць адбіты ўсе дасягненьні па прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, нацкультуры і камунальнаму будаўніцтву, устаноўкі на тэму «выканаем другую пяцігодку» і аб'ёмнай рухомай устаноўкі «крызіс капіталізму». Будынкі Пляцу Волі маюць цесную сувязь з гэтай-жа тэмай. Тамжа будуць стаяць чырвоныя дошкі лепшых прадпрыемстваў і калгасаў. Будынак ЦСПСБ будзе мець лёзунг «Прафсаюзы—школа камунізму» і дасьць паказ лепшых і найлепшых ударнікаў БССР. Афармляецца тэатральны сквер, вуліца Карла Маркса прысьвечана партбудаўніцтву і партасьвеце, прычым афармляюцца ня толькі будынкі, але і сама вуліца. Тое-ж самае будзе мець вуліца «11 ліпеня», якая афармляецца на тэму скарыстае дакументы музэю рэвалюцыі пра пэрыяд белапольскай і нямецкай акупацыі і пра дасягненьні БССР за пятнаццаць год. Шэраг пунктаў ілюмінуюцца, афармляюцца масты праз Сьвіслач і шэраг другіх аб'ектаў.

11-га кастрычніка ў залі паседжаньняў ЦСПСБ таварыства «Мастак» зрабіла выстаўку праэктаў для азнаямленьня з ёю усіх мастакоў, якія разь



Менск у Кастрычніку. Будынак ЦВК

«Гатоў да працы і абароны». Вакзал з боку пэрону нясе тэму: «Адна шостая і пяць шостых», з боку гораду вакзал афармляецца на тэму «рэканструкцыя чыгуначнага транспарту». Уезды ў горад афармляюцца аркамі-выстаўкамі з тэматыкай, прысьвечанай ураджаю і ліквідацыі кулацтва. Шэраг вуліц з буйнымі прадпрыёмствамі афармляюцца аркамі-устаноўкамі з тэмай «праца—справа гонару», «выканаем другую пяцігодку». Будуць зроблены фотавыстаўкі лепшых ударнікаў, ствараецца фотавыстаўка, якая біты на брыгады па спэцыяльнасьці. Брыгадзірамі вызначаны таварышы Алтуф'еў, Станковіч, Тычына, Сілінаў і Карпенка. У працы будуць прымаць удзел Волкаў, Грубэ, Гусеў, Гаўрыленка, Бразэр, Кастэлянскі, Пашкевіч, Азгур, Кіпніс і інш.

На сходзе мастакоў ухвалена весьці працу мэтадам сацспаборніцтва паміж брыгадамі, шэраг таварышоў абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

Усё гэта дае ўпэўненасьць што Менск будзе сваечасова і добраякасна аформлены.

АССТ.

Трыбуна пісьменьніка

М. ХВЕДАРОВІЧ

Творчая практыка мае права на мандат

Мне лягчэй было напісаць вершы, што друкуецца ніжэй, ніж напісаць пра сябе.

Пра мяне пісалі, крытыка (дзякуй ёй) мяне не абходзіла. Усё-ж лічу, што сур'ёзнага падыходу да разгляду маей творчай работы ня было.

Бо крытыка часам толькі і займалася наклейваньнем ярлычкоў, узьвядзеньнем у канон «сваіх» і падсіжваньнем і ўгробліваньенм так званых другарадных, якім мейсца было ня апошнім крэсьле. Некаторыя нашы крытыкі высоўвалі сустрэчны па «ўгробліваньні» непакорных.

Нашы правінцыяльныя «марксаеды» іншы раз зьневажалі, таптaлі ў гразь сапраўды творчыя імёны. Падкрэсьліваю правінцыяльныя, бо дзікі і някультурны абыватаь, з благаслаўленьнем некаторых працоўнікоў БелАПП'у ня меў межаў у сваіх «тэрорыстычных актах».

Пра гэта большасьць паважаных чытачоў ведае і фактаў прыводзіць ня буду.

Я асабіста паэта маладв. І можа быць, няскромна зараз пісаць пра свой творчы шлях. Усе-ж ён цікавы і паказальны для малодшых таварышоў.

Сур'ёзна стаў працаваць у 1929 годзе. Першыя крокі—гэта нясьмелая вучоба, літаральна вучоба грамаце.

Першая мая кніжка «Настроі», пра якую так шмат пісалі, была маім прыходам у літаратуру. Пэўнага літаратурнага кірунку у той час ня меў. Большасьць рэчаў у гэтай кніжцы гэта непасрэдныя ўражаньні—перажыткі маіх дзіцячых і юнацкіх гадоў, атуленыя лірычнымі настроямі. Гэта фактычна былі настроі бяздомнага юнака, дэклясаванага люмпэнпралетара, адарванага ад вескі селяніна і не знайшоўшага сабе пэўнага месца ў гарадзкім жыцьці. Усе рэчы, паўтараю, пачуцьцевыя, атуленыя непасрэдным лірызмам.

Мой творчы рост пачаўся з «Настрояў», і я адразу папаў на штыхі нашай крытыкі. Кожны крытык пісаў па-свойму, прыпісваючы ўсялякія кірункі. Адзін з крытыкаў назваў нават мяне конструктывістам. Я-ж у той час аб гэтым слове пачуў упяршыню. Цяжка было знайсьці самога сябе ў сваіх-жа рэчах, выходзячы з гэтых «крытычных» аналізаў.

Я працягваў шчыра і ўпарта працаваць. Любіў чытаць сялянскіх паэтаў, надзвычай захапляўся Хлебнікавым. Хлебнікаў інтрыгаваў мяне сваімі «загадкамі», сваімі слоўнымі пантэграмамі. Чытаў упарта і па некалькі раз адзін і той самы верш, покуль нарэшце рабілася ўсё зразумела да кожнай літары.

Усё-ж лічыў, што рэч павінна быць напісана толькі пра перажытае, што зрабіла вялікае ўражаньне і незабыўныя хвіліны. Рэчы павінны быць напісаны шчыра. У час пісаньня, тое, пра што пісаў, павінна было аўладаць маім «я». У гэты час напісаны такія вершы, як: «Творчая ноч», «Баляды», «Паэтычныя запіскі», «Недасланы ліст» і інш. У гэтых рэчах бязумоўныя зрывы ў тым сэнсе, што ў іх няма асноўнага ідэйнага стрыжня, што сама тэма ўладала мною, а ня я ёю. Ёсьць фармальныя шарахаватасьці. Усё-ж гэтыя вершы пачуцьцёвыя, і яны зараз ня страцілі свае цяплыні. Пад напорам крытыкі я пачаў праглядаць свае творчыя наканоўкі. Тымчасам са мною ўжо некаторыя «артадоксы» з БелАПП пакінулі вітацца, як з правым непралетарскім паэтам...

У гэты час я пачаў захапляцца расійскімі канструктывістамі. Мне падабаўся іхны анархізм (уляпаеўшчына), біолёгізм (Багрыцкі), што так сугучна былі да некаторых маіх рэчаў з «Настрояў». Яшчэ мяне моцна цікавіла мужная літаратурная постаць Лугаўскога, рамантыка Перакопу, фармальнае штукарства. Упарта пачынаю працаваць.

Усё-ж у мяне атрымалася тое, чаго я не хацеў. Я атрымаў, нарэшце, рытарычны верш, выхаласьціў непасрэдную настраёвую цяплыню, абяскровіў яго, зрабіў хадульным. Я паслухаў тагочасных «крытыкаў». Яны казалі так: «Пішы, паэт, пра сёнешні дзень, не скачы ўперад за ўсіх, бо паломіш ногі. Адзін казаў так: «Досыць Хведаровічу насіцца са сваімі «Настроямі паэта». У вас, паэта, павінны быць настроі пралетарыята», «У цябе няма дыялектычнага адзінства, дыялектыкі настрояў». Самы галоўны сказаў так: «У цябе не хапае індустрыяльных матываў, а то перарабіў-бы ў пралетарскага».

Я імкнуўся даць «індустрыяльныя матывы», што супярэчыла майму паглыбленаму выяўленьню творчага «я», у тым сэнсе, што чалавек складаней усялякай машыны, што чалавек творца ўсяго.

Гэта было, бязумоўна, памылкай. Мне не дапамаглі. Такому пісьменьніку трэба дапамагаць, трэба абкружаць яго ўвагай. Пісьменьнік у гэты час сур'ёзна пераглядае свой творчы пройдзены шлях, сваю творчую практыку, намячаючы новы скачок, у новае невядомае для самога сябе. Складаецца новы погляд, узбагачаецца творчая ініцыятыва.

Я ў 1931 годзе быў у такім стане. Верш «Прыблізны падлік», надрукаваны ў № 3 «Маладняк» за 1931 г., «Верш аб сябе». Я там пішу.

Я ад «Настрояў» рабіў пачатак
«Рытмы» чаканьняў пашкле галялёдзіцы.
Я на рабоце бяз белых пальчатак,
Гнаўся за шыкам налошчаных модніц.
Сам я з рыдлёўкай да сотае зморы,
Кідаўся сколам на зындру тэорый...
і г. д.

Я тагды ўжо зразумеў, што тагачаснае становішча мяне зусім саб'е з толку. Вырашыў—што-б там ня было, вярнуся да «Настрояў», прыгледжуся, выбяру асноўнае і пайду далей.

Праўда, я ўжо ў той час перарос «Настроі» у асноўным, яны зьяўляліся нібы маім вучнёўскім школьным сшыткам першай групы. Але ў сваім сшытку і праз дваццаць гадоў пазнаеш свае каракулі, іменна сваю аснову, з якой складаўся твой почарк.

Так і было. Пазнаўшы сябе, я змог намячаць далейшыя пэрспэктывы, я загаварыў на поўны голас адкрыта, проста і шчыра. Ад таго часу у мяне склаўся погляд на маю жыцьцёвую творчую практыку прыблізна такі: кожны паэт найбольш паўней павінен адчуваць у сваёй рабоце, самога сябе ў калектыве свае клясы. Поўным голасам павінен гаварыць у сваіх рэчах. Чым больш сьмеласьці, тым рэчы робяцца найбольш праўдзівымі, найбольш мастацкімі.

Я займаюся літаратурным раскрыцьцём чалавечага «я». Мая мэта паказаць чалавека ў яго жыцьцёвай практыцы, у яго клясавай прыналежнасьці, выпукліць тое, што дае права насіць пачэснае імя генія—чалавека.

У жыцьцёвай практыцы часта чалавеку няма часу аб гэтым думаць. Жыцьцёвыя дробязі робяць яго паслушным нявольнікам, які мечацца ад іхняга панукваньня да сёмага поту. Забываючы, менавіта, гэту розьніцу яго ад жывёлы, чалавек упадабляецца сваім ніжэйшым продкам. Такім чалавекам можа лёгка аўладаць страх, пакора, няпэўнасьць, нявер'е, сумненьне. Усе гэтыя элементы скарыстоўваюцца эксплёататарамі і клясамі. Я хачу сваёю творчасьцю давесьці, што ў жыцьці ў кожнага чалавека павінна быць асноўная мэта, а бяз гэтай мэты ў яго няма нічога. Яна, мэта, вядзе яго, кіруе ім у яго жыцьцёвай клясавай практыцы. Калі няма мэты, чалавек блудзіць, робіцца жывёлай.

Прыватная ўласнасьць, рвацтва, эксплёатацыя, ашуканства, няшчырасьць, вось што я хачу ўскрыць, як адмоўнае.

Мяне цікавіць толькі тое, што перарабляе сьвет. Толькі тое мае права на жыцьцё. Адсюль усё моцнае, прынцыповае, якое змагаецца за ўсьвядомленую мэту, якое ўмее цаніць свае ўдачы і промахі, якое памрэ, ці пераможа. Мая ўвага гэтаму.

Адсюль мае рэчы. «Пра ўласнасьць», якія паўгода радактары баяліся друкаваць, прыпісваючы мне ўсялякія ўхілы і надрукаваныя пасьля гістарычнай пастановы ад 23-га красавіка, верш «Геніяльны позёр», «Нарадзіўся чалавек», яшчэ не надрукаваны цыкль вершаў і інш. Вялыя людзі мяне ня цікавяць. Я толькі іх паказваю, як адмаўленьне. Мяне цікавіць тое, што ўсімі сваімі нэрвамі, зубамі чапляецца за жыцьцё, імкнецца пераварыць яго. Я хачу пісаць пра каханьне, пра рэўнасьць, харобрасьць, самаахвярнасьць, дружбу, абы гэта было сапраўдным—цэльным. Вядома, ўсе гэ*тыя пытаньні я думаю паставіць у* клясавай супярэчнасьці.

Я толькі сябе пачынаю пазнаваць як паэта, усьвядомліваць свае шляхі, заваёўваць далягляды. Мною пачала авалодваць праблема, а гэтага я чакаў аж тры гады.

Ня лішне будзе сказаць аб маім слоўным лексычным багажы. Некаторыя паэты баяцца новых слоў. Кажуць незразумела будзе.

Глупства. Безьліч слоў за апошнія гады атрымала шырачэйшае распаўсюджаньне. Наш-жа слоўнік вельмі бедны. Кожнае слова гэта—скарб. І нечага баяцца незразумеласьці. Але словы павінны быць апрацаваны ў сэнсе гучаньня да таго азначэньня, ад якога яны бяруць імя. Словы новыя трэба прадумаць і сьмела пускаць гэты надзейны капітал у абарот.

ВЕРШЫ МІКОЛЫ ХВЕДАРОВІЧА

I

МУЖНАСЬЦЬ

Няма недасяжнасьці—ёсьць
Упартая хада ў заўтра.
Звычайкі,—проймы—хісткі госьць,
Жыцьцё-ж бязьлітасна і ўпарта.

Яму ня вер. На слова «ёсьць»
Заўсёды «не» адкажа кпінна.
Яна, сапраўды—маладосьць—
На спрэчках гарт набыць павінна.

Яе такую я цаню,
Як маткі шчырасьць, мэты вартасьць.
Ад плойм прадажніцкіх манюк
Я стаўлю строгую упартасьць.

І той, хто хіліць нізка стан,
Кім вецер шалы вандалужыць,
Пакору кінь, і ў ровень стань,
На мужнасьць—стаў сьвятую мужнасьць!

І ўсю сваю жывую моц
Гарачаю крывёй асьвежыш.
На строй пярэчлівых умоў,
Ступай на новыя узьбярэжжы.

Няма ня ўзятых пуцявін,—
Мінор ў намеры, крык сумненьняў,
І страх варожае крыві,
І безнадзейныя імкненьні.

Сапраўды-ж ў поце даўся хлеб,
У загінах выблісьнула слава.
Ня зморыць волю цёмны склеп,
Ня зьнішчыць чорная аблава.

Страчай яе жывым агнём,
Згары за стаўленую мэту.
Няхай навалаў буралом,
Што песьняй нашаю сагрэты—

Сатрэ з дарог таго сьляды,
Зьмяце, як пыл сівых стагодзьдзяў.
І армія маладых
На костках кволых запаходзіць.

Каго спужае здані страх
І ахіне бязвольнай сінью,
Ён слова мужнае «ура»
Адчуе слодычу цяпльнай.

Складзі яго жыцьцё ў архіў,
Імя стапчы нагамі дужых.
За ўсе перажытыя грахі
Няхай-жа кпіць над імі мужнасьць

Да душы ня люблю журбаваць,
Загартованы горкаю доляй.
Знаю добра—мая галава,
І нічога ня трэба мне болей.

Я багаты, бо рукі ёсьць,
Забубенную голаву вышай
Я трымаю, хоць гора—госьць
Самы ўпарты і самы увішны.



II

Я СЬМЯЮСЯ...

Я сьмяюся да болю, да сьлёз,
Я, каторы, ня ўмею плакаць.
Шлях мой чмары, і горкі скрозь—
Бесхацімца і неўдакі.

Але гэты барвовы прастор
Повен паху жыцьцёвае волі.
Не хачу ні чырвонцаў, ні зор,
Мне даволі, усяго даволі.

Толькі-б жыць, толькі-б дужым быць,
Мець сарочку, вугал і кнігі.
Толькі-б жыць, толькі-б жыць толькі-б жыць,
Хоць якім, хоць жыцьцём маталыгі.

Калі-ж крадзецца змрокамі сум
(Я рэўную, сумую, кахаю),
Вочы вышай на змрок узьнясу
І сьпяваю, ад гора сьпяваю.

Колькі вёснаў жыцьцёвых зьбяром—
Гэта рэбус, сьляпая няпэўнасьць.
Вось таму працінае нажом
І каханьне, і дзікая рэўнасьць.

Я кахаю мацней і мацней
Працу, пэўнасьць свае канаоўкі.
Усё што створана мною—маё,
Заштрахаванае і без штрахоўкі.

І калі за няўпэўнены крок,
За няшчырасьць, радкоў падфарбоўку
Мне па праву паставяць папрок,
Прапануюць плаціць няўстойку—

Не пакіну няўзяты рубеж:
Працай дужай, настойнай, упартай
Даканаю «няўдаку» сябе,
Навярстаю прайграную карту.

І па праву змагу зноў кахаць
Працу, пэўнасьць свае наканоўкі.
І ня дамся мяне папіхаць
Заштрахаванаму і без штрахоўкі.

«Я», каторае творыць, жыве,
Плача, любіць, рэўнуе, сьмяецца,
Хай пачуе цалюсенькі сьвет:
— Ня купленае—не прадаецца!

Я аддам сваёй клясе ўсё:
Розум, сілу і нават кнігі,
Хай ушчуне, ці ўвысь узьнясе
Непадкупнага маталыгу...

І сьмяюся да болю, да сьлёз,
Хіба-ж можна такому плакаць?
Шлях мой цяжкі і сьветлы скрозь—
Басхацімца і неудакі.

III

І ТАК ДАЛЕЙ...

Прастор мой любы, неабдымны,
Чарод нясходжаных пуцін...
Пайду праз чэмерныя кпіны,
Сярод бахвальшчыкаў—адзін.

Барвовасьцю мой шлях уквечан,
Маланкі крэсьляць далягляд...
Мая жыцьцёвая сустрэча
Міргае зрэнкамі назад.

Такое радаснае веі
Ня ведаў чае зямной хады,
Такое пэўнасьці надзеяў
У сузор'ях вочаў маладых.

Праверан пэўны мой кірунак,
Як зьмена дзён, як зьмена год.
Стаю надзейны і ўдумны
На стыку спрэчных перашкод.

Запаланелая імглістасьць
Мігціць празрыстай стомай у ноч.
Маіх надзеяў урачыстасьць,
Чарней агню каханых воч

З такой адданаю пакорай
І маладосьцю прыгаства,
Крыштальнай чыстатою мора
І бурай мора ў час навал.

Вось так—цяжар няўцям ў дарозе,
Крыляе ўзьлёт маіх надзей
Ад перамогі, к перамозе,
Ад скону дня, да новых дзей.

Душа нязьлічана праклёнаў
Пашле на змогу гіблых спраў.
Майму зямному перакону—
Яшчэ карцець, яшчэ зырэць,

Яшчэ крыляць у сінь туманаў,
Зіхцець ў рабінавую ноч
Ад драгацэннасьці даманаў,
Да чарнаты дзявочых воч,

Пылаць ў абдымках дня і шчасьця,
Званіць ў разбэшчаную медзь,
І цяплынёю сонца засьціць,
Аркестраў гром перагрымець.

Чароўнасьць даляў, сонца вырай,
Атуленасьць асеньніх мар...
Плятуцца ў неабдымнай шыры
Абрыўкі здрасаваных хмар.

А ты, прастор мой урачысты,
Чарод нясходжаных пуцін...
...Вачамі ў цёмную імглістасьць
Праз перашкоды і—адзін.

IV

СЯБРЫ ВІТАЙЦЕ...

Сябры, вітайце мой прыход,
Гушчэльня мрокаў, прэч!
На згубу—выраклы той год
Ліхіх маіх сустрэч.

На згубу—вязь калючых гліц,
Садом вароньніх грышч,
Мы тлумы іх перамаглі
Агнівам папялішч.

Сябры, вітайце-ж паварот
На сонечны разьліў.
Ён зычыць тонны умалот,
Чый пот паіў палі.

Ня ступіць нанава ступня
У акрэсьленьне дарог.
Дарма усходзіцца брахня
На дальні Казярог.

Сябры, вітайце голас мой
Удумлівых пяшчот.
Ён—мора шумнага прыбой
І белазубы рот.

Парваных струн замоўкнуў брэнк,
Іржой цьвірчыць ня ўлад.
Кажан любуе іхны енк,
У абдыме тлее мгла.

Мінаю я ў распуцьці лет
Быліцы ў нябылом,
Крывёй аплаканы іх сьлед
Здаю уцілю ў лом.

Сябры, вітайце голас мой
Удумлівых пяшчот.
Ён—мора шумнага прыбой
І белазубы рот.

Пра Бэранжэ

Чарговае паседжаньне Інстытуту Літаратуры і Мастацтва Беларускай Акадэміі Навук было прысьвечана разгляду творчасьці выдатнейшага францускага паэта П'ера Бэранжэ. Паседжаньне адбылося 15-га кастрычніка ў Доме Пісьменьніка.

З вялікім дакладам пра творчасьць і жыцьцёвы шлях Бэранжэ выступіў праф. Барычэўскі.

Трэба адзначыць, што паседжаньні Інстытуту, што маюць выключнае значэньне ў нашым літаратурным жыцьці, мала прыцягваюць увагі да сябе літаратурнай грамадзкасьці. Гэта, відаць, трэба тлумачыць дрэннай пастаноўкай работы Інстытуту Літаратуры і Мастацтва БАН...

Ч.

Пашыраецпа Дом Пісьменьніка

Менскім Гарсаветам прымаюцца захады да таго, каб у бліжэйшыя дні перавесьці рэдакцыю «Калгасьніка Беларусі» з будынку Дому Пісьменьніка ў былое памяшканьне Калгасцэнтру. Такім чынам, другі паверх будынку вызваляецца пад Дом Пісьменьніка.

Праф. Н. Ефімаў

Пабудова сацыялізму і клясыкі

XVII партканфэрэнцыя асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі паставіла канчатковую ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, што параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю і пераадоленьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і ў сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавае сацыялістычнае грамады.

У ажыцьцяўленьні другой сацыялістычнай пяцігодкі вялізарная роля належыць мастацтву, мастацкай літаратуры.

Часам можна пачуць скаргі на адставаньне нашай літаратуры ад задач эпохі сацыялістычнай рэканструкцыі. Але адзначаючы адставаньне ўсё-ж варта помніць грандыёзны памер барацьбы і, падводзячы падсумаваньне таму, што да другой пяцігодкі створана творчымі кадрамі пралетарыяту, *бачыць і па вартасьці цаніць небывалыя* дасягненьні пралетарскае мастацкае творчасьці: пралетарская літаратура Савецкага Саюзу стала сусьветнай пралетарскай літаратурай. Яе лепшыя творы зьявіліся сьцягам барацьбы для камуністычнага авангарду ўсіх краін. Нашы пісьменьнікі разам з лепшымі рэвалюцыйнымі пісьменьнікамі капіталістычных краін вышлі на арэну сусьветнага змаганьня рабочае клясы, уступілі ў вялікія спрэчкі з міжнароднай буржуазіяй па цэнтральнаму пытаньню—«быць, альбо ня быць» сапраўднай сацыялістычнай мастацкай літаратуры сусьветнага размаху.

Правая небясьпека ў адносінах да спадчыны характэрызуецца разуменьнем разьвіцьця сацыялістычнай літаратуры ў сэнсе прамой і мэханістычнай прыймальнасьці, альбо па аналёгіі з той, альбо іншай літаратурнай плыньню мінулага: прадстаўленьнем пра спэцыфічнасьць буржуазнага мастацтва, як пра спэцыфічнасьць мастацтва наогул; забыцьцём, альбо недаацэнкай якаснай прыроды савецкай пралетарскай літаратуры; тэндэнцыі накіраваць яе разьвіцьцё па шляху станаўленьня, рэстаўратарства; зьніжэньнем яе клясавай накіраванасьці і, побач са зьмяншэньнем ролі сьветапогляду ў працэсе мастацкае творчасьці. Гэта суцэльная ліквідатарская праграма! Гэта наш галоўны і найбольш моцны вораг!

«Левая» небясьпека — буржуазныя ўплывы, што маскуюцца «лявізной»—выяўляюцца асабліва ў адмаўленьні ўсваеньня і пераапрацоўкі клясычнае літаратурнае спадчыны; у адмаўленьні і недаацэнцы барацьбы за мастацкасьць, пад выглядам дастатковасьці пакуль што літаратурнае утыльсыравіны; у недаацэнцы, альбо ў прамым адмаўленьні мастацтва, як формы пралетарскай ідэалёгіі. Гэта зусім ня менш ліквідатарская і цэласная праграма. Гэта вораг, перамога над якім неабходна для руху да стварэньня сацыялістычнай літаратуры. Вось дзьве варожыя савецкай літаратуры плыні, якія злучаюцца ў імкненьні разброіць пралетарыят мастацка, разброіць перад тварам клясавага ворага, перад буржуазіяй, перад старой буржуазнай літаратурай. Ленін гаварыў пра насьледваньне пралетарыятам культурнай спадчыны мінулага і пра яе крытычную апрацоўку. «Пралетарская культура, казаў Ленін, не зьяўляецца выскачыўшай невядома адкуль, яна павінна зьявіцца законамерным разьвіцьцём тых запасаў ведаў, якія чалавецтва назьбірала за ўвесь час сваей гісторыі». «Трэба ўзяць усю культуру, якую капіталізм заставіў і з яе пабудаваць сацыялізм». Ленін меў на ўвазе дыялектычную, не падобную на агульсае адмаўленьне, ні на сьляпое рабскае падражаньне. Такая пераймальнасьць прапаноўвае зьмену крытэрыяў, зьмену законамернасьці разьвіцьця, што вызываецца і акрэсьліваецца сацыяльнымі пераваротамі, зрухамі ў адносінах клясаў, дыялектыкай клясавага змаганьня.

Разьвіцьцё нашае літаратуры пад *такім пунктам гледжаньня ўключаецца* ў доўгую гісторыю чалавечага мастацтва, але пры гэтым трэба памятаць, што гэта гісторыя чалавечага мастацтва ведае рэвалюцыі эстэтычных прадстаўленьняў, літаратурных стыляў, якасныя скачкі пры пераходзе да новых этапаў, пры гістарычнай зьмене пануючых клясаў.

Партыя дала лёзунг стварэньня Магнітабудаў літаратуры, з тае прычыны, што партыя стаіць на чале сусьветнай гістарычнай барацьбы рабочае клясы на ўсіх яе вучастках. Што азначае «Магнітбуды літаратуры»? Гэта значыць стварыць такія творы, якія па сацыялістычнаму пераапрацоўвалі-б чалавечую псыхіку, таксама як па-сацыялістычнаму пераапрацоўваюць нашу краіну гіганты будаўніцтва, падобныя да Магнітабудаў.

Што мы можам узяць пры пабудове Магнітабудаў сацыялістычнай літаратуры клясаў, гэта значыць у тых мастакоў мінулага, якія з найбольшай эдэкватнасьцю і разам з тым экспрэсіяй, тыпізуючых, сынтэзуючых вобразах адбілі існасьць дадзенай, гістарычна-канкрэтнай сацыяльнай рэчаіснасьці ў сьвятле ідэй сваей эпохі, норм дамінуруючае ў гэтую эпоху клясы?

Быў высунуты ў нашай літаратуры лёзунг «дагнаць і перагнаць клясыкаў». Гэта ўстаноўка зьяўляецца глыбока памылковай і шкоднай: яна затушоўвае прынцыпіяльную ідэолёгічную розьніцу пралетарскай літаратуры ад буржуазнае.

З гэтай прычыны ЦО «Правда» і «Камсамольская Правда» зусім правільна крытыкавалі гэту памылковую фармуліроўку. У перадавіцы «Правды» прысьвечанай кіно, паказвалася, што быў выкінуты лёзунг у галіне кінематографіі—«дагнаць і перагнаць буржуазнае кіно»,—у такой пастаноўцы пытаньня апартуністычна, дзяляцка змазваецца якасная розьніца паміж пралетарскім кіно і буржуазным. Гэта тым больш адносіцца да пралетарскай літаратуры.

Падкрэсьліваючы гэтую памылку, патрэбна адначасова прызнаць адставаньне савецкай літаратуры ад гераічнай практыкі рабочае клясы, трэба сказаць проста, што ў гэтых адносінах мы адсталі ад клясыкаў, адсталі ў тым сэнсе, што клясычна-буржуазная і дваранская літаратура куды больш ярчэй і глыбей адбівала ў сваіх вобразах практыку свае клясы, лепш і паўней служыла сваёй клясе, з вялікай сілай выконвала сваю сацыяльную функцыю. Мы яшчэ не дасяглі таго ўзроўню ў авалодваньні сьветапоглядам свае клясы, якога дасяглі клясыкі ў адносінах сьветапогляду сваіх клясаў. Зразумела, што дыялектычны матэрыялізм якасна вышэй сьветапогляду Пушкіна і Гётэ. Але ўзровень авалоданьня гэтым якасна-высокім сьветапоглядам у большасьці нашых пісьменьнікаў ніжэй, чым узровень авалоданьня сьветапоглядам свае клясы, у сваю эпоху, у Пушкіна і Гётэ. Маем пакуль што адставаньне ўзроўню ад якасьці.

Знаходзяцца яшчэ дзівакі, што вераць выдумкам буржуазных крытыкаў пра тое, што калі, скажам, Тургеняў пісаў свае творы, дык яму быццам-бы перш-на-перш за ўсё патрэбны былі іх «музыка», іх «стыль» у тым сэнсе, які недаюць гэтаму тэрміну буржуазныя крытыкі. Гэтыя людзі ня хочуць зразумець, што творчасьць Тургенева была клясава-асьвядомлена, што ён быў сапраўдным барацьбітом свае клясы, што калі Талстой пісаў «Вайну і мір», дык перад яго разуменьнем стаяў ненавісны для яго вобраз вялікага рэвалюцыянэра Чарнышэўскага. Кожным радком свайго раману, захапляючы нас сваім эпічным спакоем, Талстой намяраецца ў Чарнышэўскага і яго рэвалюцыйны штаб. Калі Тургеняў лепіць свайго базарава ў «Отцах и детях», дык ён таксама зьбіраецца пасароміць разначынны нігалізм, што ня прыемлемы для яго сацыяльнай групы. Тургеняў умеў манэўраваць: адносячыся добра да Бялінскага, ён не пасароміўся выкарыстаць свой некролёг пра Бялінскага ў якасьці баявой зброі супраць клясавага ворага, зброі, накіраванай супроць таго Чарнушэўскага, які выступаў ня толькі супраць той часткі дваранства, якую прадстаўляў Талстой, але і супраць той, якая ішла на блёк з буржуазіяй, абуржуажывалася і ідэолёгам якой быў Тургеняў. Аўтар афарызму «Венера Милосская не сомненнее принципов 1789 г.». Тургеняў зусім не пасароміўся свой некролёг пра Бялінскага завастрыць супраць Чэрнышэўскага, супрацьпаставіць Бялінскага Чарнышэўскаму і г. д. і г. д.

Калі прыпомніць той вялізарны ахоп практыкі свае клясы, які мы сустракаем у творчасьці Шэксьпіра, Бальзака і інш. клясыкаў дваранскай буржуазіі, і ўзяць практыку рабочае клясы, нязьмерна больш багатую, больш складаную, больш шматкаляровую, чым практыка ўсіх іншых былых у гісторыі клясаў, дык убачым, як сапраўды надзвычай вялікае адставаньне пралетарскай літаратуры. Гогаль на такім вузкім прапластаваньні, як гінучая дробная і сярэдня-памесная дваранства, змог разгарнуць вялізарнае багацства якасна-розных тыпаў. Аўтар «Рэвізора» і «Мёртвых душ» змог на гэтай вузкай базе стварыць шырокую галярэю арыгінальнага вобразу. Значна больш адценьняў ёсьць у рабочай клясе, што ідзе не на гібель, як кляса Гогаля, а на вялікі ўздым. Але-ж рабочая кляса паказана ў нашай пралетарскай літаратуры куды бядней, чым гінучая памешчыцкая кляса была паказана ў творах Гогаля. На IV пленуме РАПП тав. Фадзееў гаварыў пра тое, што Леў Талстой у маленькім апавяданьні «Смерть Ивана Ильича» паказаў з надзвычайнай сілай усю сваю філязофію, усю філязофію сваёй гінучай сацыяльнай групы. Калі пралетарскі пісьменьнік піша свае апавяданьні, вершы, нарысы (скажам, нарыс пра ўдарніка), ён павінен імкнуцца да таго, каб прасякнуць кожны радок самага маленькага апавяданьня, самага маленькага нарысу вялікім, асноўнымі ідэямі свае клясы. Пралетарыят пачынае якасна-новую непараўнальна больш значную ў адносінах да ўсёй мінулай гісторыі главу чалавечай гісторыі, уводзіць у дзеяньне зусім новую гістарычную законамернасьць, якая фармуе новую людзкую пароду, новага сацыялістычнага чалавека. Мастацка паказаць гэта і ёсьць наша задача, сусьветна-гістарычная задача пралетарскай літаратуры. Справа нашых пісьменьнікаў сказаць пра гэту новую сацыялістычную праўду, сказаць пра яе моцна, на ўвесь голас, на ўвесь сьвет.

Сказаць гэту новую сацыялістычную праўду ня лёгка таму, што для гэтага патрэбен такі ўзровень марксыцка-ленінскага сьветапогляду, які-б дапамог мастаку ахапіць усю складанасьць зьявішч нашай якасна-новай і зусім непадобнай ад мінулага рэчаіснасьці. Гэта зусім добра разумелі прадстаўнікі старой літаратуры: яны разумелі ролю мастацкай творчасьці вядучых ідэй, пануючых думак свайго часу і сваіх клясаў.

Сіла нашай літаратуры ў тым, што рэчаіснасьць дае ёй вялікую сынтэтычную ідэю. Мільёнамі працоўных валодае самая перадавая сусьветная ідэя, а гэта і зьяўляецца тэй прад'умовай, якая забясьпечвае надзвычай на высокі росквіт нашага мастацтва.

Аўладаць мэтадам дыялектычнага матэрыялізму ў мастацтве гэта перш за ўсё азначае—навучыцца гаварыць праўду пра наму сацыялістычную рэчаіснасьць у яе барацьбе са старою, навучыцца гаварыць праўду пра фармаваньне новага сацыялістычнага чалавека, гэта азначае, для мастака сьцьвердзіць у сьвядомасьці мільёнаў ідэю камунізму.

А сьцьвердзіць ідэю камунізму адначасова азначае выкрыць у сьвядомасьці мільёнаў ману капіталізму, разброіць вядучыя ідэі буржуазіі, якія здаваліся буржуазіі вялікімі, нязрушнымі, вечнымі. Пралетарскі мастак сьцьвярджаючы праўду камунізму, ня можа абыйсьці, пра што-б ён ня пісаў, крушэньне гэтых «вечных ідэй мінулага», паколькі крушэньне іх аблягчае рост новага.

Мастацтва, за якое змагаецца пралетарская літаратура, павінна вышэй узьняцца за ідэйна-мастацкі ўзровень клясычнай літаратуры адміраючых клясаў. Ёсьць прыхільнікі ператвараць клясыкаў у нейкі абсалютны нярухомы абстрактны крытэры для пралетарскага пісьменьніка: пішы і рабі параўнаньне ці многа яшчэ табе засталося да Шэксьпіра, Пушкіна, Талстога, Грыбаедава. Гэта разуменьне вучобы ў клясыкаў прадстаўляе сабою вульгарызацыю творчай лініі пралетарскай літаратуры. Адзіным рашаючым крытэрыям праверкі работы пралетарскай літаратуры ў цэлым і кожнага пралетарскага пісьменьніка ў прыватнасьці зьяўляецца крытэрый практыкі вялікае рэвалюцыйнае клясы, што штурмуе сьвет. У якой меры глыбока і поўна выражае пралетарская літаратура, асобны пралетарскі мастак практыку клясы, што будуе сацыялізм?

Той, хто кажа пра новых Талстых альбо Шэксьпіраў, зьмяншае задачу пралетарскай літаратуры. Пралетарскі «Талстой» альбо пралетарскі «Шэксьпір» ня могуць быць новымі Талстым альбо Шэксьпірам, наш раман **ня можа быць** проста ідэолёгічна вытрыманым жанрам старой літаратуры, наш тэатр ня проста новае віно, улітае ў старыя мяхі, наша музыка зусім не паўтарае ад Дэбюсі да Бэтховэна, альбо ад факстроту да царкоўнай мэлёдыі: наша мастацтва—гэта рэвалюцыя ў галіне мастацтва, гэта мастацтва і будзе крокам, львіным скачком, пераваротам у мастацкім разьвіцьці чалавецтва.

Ідэалістычная крытыка выставіла палажэньне пра міравыя, агульна-чалавечыя, вечныя вобразы клясыкаў. Ці можам мы прыняць гэту кананізацыю? Пра што гавораць нам усе гэтыя вобразы? У іх гучыць для нас боль і цярпеньня чалавецтва ўсіх клясавых фармацый уласьніцкага чалавека. Уціск чалавека, чалавекам у розныя часы парадзіў падхалімства, ілжывасьць, хвальбу, помсту, цынізм імкненьне навекі ўтрымаць сацыяльна-мінулае, тыя рысы, якія выражаюць усе гэтыя Хлестаковы, Тартарэны, Дон-кіхоты і г. д.; парадзіла імкненьне цаною вялізарных мук парваць сацыяльныя ланцугі і паўстаць супроць бога, творца—па ўяўленьню таго чалавека—прыроды, якая зьняволіла і ўнізіла чалавека, прывяла байронаўскага Каіна да бунту супраць волі бога, Прамэтэя да рашучасьці захапіць агонь у багоў і вярнуць яго чалавецтву. Таксама ўлада чалавека над чалавекам, уласьніцкі пачатак парадзіў рэўнасьць Атэло, прывёў да трагічнага расчараваньня караля Ліра, галоўная задача дачок якога—падзел бацькаўскае спадчыны, адсутнасьць сацыяльнай свабоды парадзіла трагэдыю Ромэо і Джульеты. Розныя ў сваім канкрэтным праяўленьні на розных гістарычных этапах і ў розных клясавых умовах, усе гэтыя заганы і імкненьні, боль і мукі чалавецтва былі характэрнымі для ўсяго клясавага ўласьніцкага пэрыяду чалавечай гісторыі. Усё гэта вобразы не пазаклясавыя, не агульна-чалавечыя і ня вечныя, тав. Нусінаў прапануе называць іх «вековыми», яны ўласьцівы ўсяму клясаваму пэрыяду чалавецтва: іх генэзыс ідзе ад уласнасьці, ад уціску чалавека чалавекам. Людзям бясклясавае грамады будуць неўласьцівы перажываньні, выклікавыя ўласьніцкім грамадзкім ладам, і гэтыя вобразы ня будуць іх хваляваць. Перажываньні Тарцюфа, Агэлю пэўна, будуць для іх прадстаўляць такі-ж інтарэс, як вывучэньне інстынктаў жывёлы высокай псыхічнай арганізацыі. Да перажываньняў Дон-Кіхота, Прамэтэя, героя грэцкіх трагедый лёсу гэтыя людзі аднясуцца так, як нашы сучасьнікі адносяцца да наіўных вераваньняў першабытных плямён. У літаратурным пляне гэтыя творы будуць для іх такімі-ж прымітыўнымі, як для нас помнікі старажытнага казачага эпасу. Канец клясавае грамады азначае канец і гэтых вобразаў. Са згубай панаваньне чалавека над чалавекам, са зьнішчэньнем клясаў уласнасьці гэтыя вобразы згубяць сваю былую ўласьцівасьць. Далей, зразумела, будуць жыць тыя вобразы клясыкаў, якія зьмяшчаюць у сабе праблемы, вырашэньне якіх не павінна наступіць са зьнішчэньнем клясавае грамады. Пытаньне пра тое, чым ёсьць ісьціна, праблема граніц чалавечага пазнаньня, журба па геніяльнасьці мае, пэўна, вядомае значэньне ў вызначанага ліку пакаленьняў бясклясавае грамады для вобразаў Гамлета, Фаўста, Моцарта і Сальеры, але паколькі бясклясавая грамада гарантыруе разьвіцьцё ўсіх закладзеных у чалавеку магчымасьцяй, паколькі сацыяльныя перамогі зробяць чалавецтва ўсё менш і менш успрымальным да мук Гамлета, Фауста і інш. Захаваюць у сабе цікавасьць у бясклясавай сацыялістычнай грамадзе і праблемы жыцьця, маладосьці, каханьня і інш.

Калі пралетарыят на той нябывалай па моцы базе, якой зьяўляецца сацыялістычная вытворчасьць, створыць агульна-чалавечую культуру і літаратуру, клясыкі мінулых стагодзьдзяў ператворацца ў музэйна-гістарычны матар'ял, цікавы для разуменьня мінулага. Але пакуль пралетарыят знаходзіцца яшчэ на шляху, у сэнсе разьвіцьця сваей культуры, клясыкі складаюць для яго дужа важную дапамогу ў справе пабудовы літаратуры новае якасьці, новага стылю.

Як-жа можна выкарыстаць клясыкаў? Браць іх патрэбна, зразумела, з адборам, таму, што адно ў іх нам можа быць блізкім і родным, а другое чужым і мёртвым. Узяць у іх варта, зразумела, ня толькі тэхнічныя прыёмы, майстэрства моўнага афармленьня, сродкі эстэтычнага ўздзейнічаньня, ня толькі тыя ці іншыя падходзячыя жанры, але і дэмакратычныя і сацыялістычныя элементы літаратурнае спадчыны, перш-на-перш, што лепшыя клясыкі адмаўляюць у клясавым чалавека, у клясавым грамады: грубасьць быту, вузкасьць думкі, няўменьня зразумець іншага, тупы жыцьцёвы кансэрватызм, уціск і прыгнёт. У клясыкаў пад'ёмных эпох былі вялікія запатрабаваньні да чалавечага жыцьця, да грамады, да асобы, шырокія ўяўленьні пра тое, што чалавеку патрэбна, каб хоць крыху задаволіцца.

Тут нам цікавы тыя ідэі, якія ў клясавай грамадзе не змаглі быць даведзенымі да канца і атрымоўваюць сваё практычнае ажыцьцяўленьне менавіта ў наш час. Гэтыя кветкі мінулага, будучы асьвежанымі нашай жыватворчай вадой, зноў расквітаюць. Гэтыя творы гавораць для нас гучным голасам, зноў пяюць свой сьпеў і ён **досыць добра выходзіць у агуль**ным хоры нашых галасоў і тое, што гучыць на наша вуха фальшыва,—згадвае пра неабходнасьць стварыць яшчэ лепшы і больш сучасны сьпеў. Высокія патрабаваньні да жыцьця, якія прад'яўлялі клясыкі перадавых груп і эпох, вядома, будуць ажыцьцяўленымі ў камуністычнай грамадзе, і толькі там. Клясыкі, што адмаўлялі жабрацтва дасацыялістычнага жыцьця, супадалі ў сваім адмаўленьні з нашым перакананьнем, што да ажыцьцяўленьня камунізму няма гісторыі, а ёсьць толькі падгісторыя, зьяўляецца толькі падрыхтоўчай клясаю да стварэньня сапраўднага чалавецтва, якое зьявіцца ў выніку скачка з царства неабходнасьці ў царства свабоды.

Усе памятаюць словы тав. Сталіна пра тое, што няма такой крэпасьці, якую-б ня ўзялі бальшавікі. Перад пралетарыятам у літаратуры стаяць вялікія крэпасьці, але ён возьме гэтыя крэпасьці, і пабудуе сапраўднае, самае высокае, яшчэ невядомае сьвету, мастацтва, якое заставіць далёка за сабою клясыкаў мінулага.

З ЗАМЕЖНАЙ ПАЭЗІІ

МАЙКЛ ГОЛД

Трэцяя ступень

(Third degree)

Пяць дужых шпэгаў у камэры вастрожніка
Гатовы пабажыцца,
што прымусяць яго гаварыць.
Яны штурмуюць яго,
Як ашалелыя ад смагі бугаі
у быдлячым вагоне.
Яны злуюцца,
што у гэтай змрочнай камэры
ім мала месца.
Цяжкая вопратка ім не дае разгарнуцца,
Іх душаць белыя каўнерыкі.
Яны бурчаць, пацеюць
і лаюцца пад музыку нагаяк
Пяць дужых шпэгаў у камэры вастрожніка.
Яны прагна круцілі
вастрожнікавы рукі,
аж пакуль трэснулі косьці,
бледныя скроні зьбілі нагайкамі,
абсацамі скакалі па сьціне,
З роту зрабілі крывавую пляму,
раструшчылі нос
і вочы агарнулі імглой.
Пяць дужых сышчыкаў
ў камэры вастрожніка
гатовы пабажыцца,
што канечна прымусяць яго гаварыць.
Месяц у белым вявінным убраньні
Памылкова зірнуў сюды і схаваўся,
бо ведае, што тут ён не патрэбны.
Там уверсе, на вуліцы,
П'яная дзеўка ў таксі
Рагоча са сваім любоўнікам.
У калідоры
пад самотны сьвіст газьніцы
бразгае ключамі вартаўнік.
Вастрожнікі варочаюцца на юрцах
і сьняць,
што яны зноў дома.
А ў гэты час
пяць дужых шпэгаў у камэры вастрожніка
заклінаюць яго ўсім на сьвеце,
што ён мусіць сказаць.
Ой, валавяныя бізуны,
Цяжкія боты
і валасатыя юдавы кулакі.
імкнуцца пераканаць вастрожніка
Загаварыць.
Яго змардаванае сэрца.
Крычыць, што ён мусіць сказаць.
Скрываўленае цела плача,
Як дзіцянё, спалоханае пацуком:
«скажы!»
Яго мазгі гараць як у вагні
і енчаць:
«скажы! Скажы!»
і стогне кроў:
«Цябе чакае жонка, каму-б табе не сказаць?»
і ўвесь сьвет
раве ў вушшу яму мільёнам дзікіх галасоў:
«Дальбог, гавары, чалавеча».
Але вастрожнік—
Нічога не скажа.
Па-над горадам ціхая, летняя ноч
На вуліцы цёпла
і людзі ідуць на праходку.
На кожным рагу
пад высокім ліхтаром
полісмэн дрымотна гайдае нагайкай.
Прапаведнікі ў габінэтах
абдумваюць казаньні
і мэр
п'е ліманад
на даху высокага дому.
Судзьдзі
Пасьля турботнага дзелавога дню,
чытаюць сваім жонкам вершы
закаханыя сядзяць побач
у змрочных кіно
і ўздрыгваюць, калі сутыкаюцца іх целы.
Матка кладзе дзяцей спаць,
а бацька смокча танную люльку.
Цішыня.
Поўніць мільёны кватэр
цікань(н)ем гадзіньніка
А ў камэры вастрожніка
Пяць дужых шпэгаў гатовы пабажыцца,
што ім канечна ўдасца
прымусіць яго гаварыць.
Нагайкі падаюць і уздымаюца,
жалезныя абцасы.
штампуюць вастрожнікаў твар.
Шпэгі зьдзіраюць успацелыя каўнерыкі
і звычна ўздыхаюць,
ўсё адно як любоўнікі
ў прыпадку экстазу.
Вастрожнік
на момант заплюшчвае вочы
і бачыць у сусьветным болю
віхуру мільёнаў зор
Ён да крыві кусае губы,
каб толькі не загаварыць
і скрываўленымі вуснамі моліць
каб нянавісны капіталістычны сьвет
ніколі ня прымусіў яго сказаць,
Каб пяць дужых шпэгаў у яго камэры
нізавошта, ніколі ня здолелі
прымусіць яго сказаць.

Пераклад з ангельскае
А. МАРДВІЛКІ



Беларускія і яўрэйскія пісьменьнікі, работнікі Дзяржаўнага яўрэйскага театру разам з пісьменьнікам Д. Бэргельсонам перад яго ад'ездам з Менску.

С. КУНІЦКІ

Пра зборнік вершаў І. Шапавалава „Товарищ“

Зборнік вершаў «Товарищ»—гэта першы зборнік, гэта першая спроба маладога аўтара ў галіне мастацкай літаратуры. Гэты зборнік невялікі, ён уключае ўсяго дванаццаць невялікіх вершаў.

На жыцьцёвую зьяву, на факт І. Шапавалаў кідае зусім яркія, зусім выразныя прамяньні.

У кожнай рэчы ён бачыць актыўныя бок.

Кожны аб'ект творчасьці бярэцца ў канкрэтным яго дачыненьні да сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва.

Калі І. Шапавалаў гаворыць пра літаратуры, дык перш за ўсё ён літаратуру разглядае як гострую зброю ў барацьбе клясаў.

«Литература
не книжечки просто,
не просто стишки,
сказочки или быль.
Это—
одно из самых острых
орудий
классовой борьбы».

Для яго мастацкае слова гэта не «побрякушки», а «снаряды в кровавом бою».

Ён умее ў невялікім знайсьці актуальнае, у звычайным «штодзённым» падкрэсьліць клясавую сутнасьць, умее за словам бачыць клясавы зьмест.

У гэтых адносінах зьяўляецца характэрным яго верш «Товарищ», якім іменуецца і адкрываецца зборнік.

І. Шапавалаў да гэтага слова «таварыш» падыходзіць перш за ўсё, як да выражэньня пэўнай клясавай сутнасьці.

«.......за право
Товарищем
зваться.
Жили,
боролись,
гибли,
дрались.
Наши
отцы
и братья».

Ён гэтаму слову надае глыбокі клясавы зьмест.

І зусім правільна заяўляе малады паэта:

«Пока мир
пополам расколот,
«Товарищем»
назову я
не всякого.
И не всякому
себя так звать
позволю».

У вершы «Мы беспартийные... наше дело—сторона» завастраецца ўвага на выразных адносінах да рэвалюцыі, да сацыялістычнага будаўніцтва. Ён ставіць у гэтым вершы пытаньне чотка: «враги пятилетки—лично наши враги».

Пралетары на вышыні сацыялістычнага будаўніцтва, у абставінах клясавай барацьбы павінен быць клясава пільным, ён павінен да ўсяго адносіцца па партыйнаму, павінен быць адказным:

«и за себя
и за завод
и
за
пролетарскую
революцию
вцелом!»

З пункту гледжаньня пралетарскай рэвалюцыі І. Шапавалаў разглядае і самагубства У. У. Маякоўскага, у вершы «По какому праву?» Да самагубства Маякоўскага ён падыходзіць не як да сьмерці чалавечага арганізма ў біялёгічным разуменьні, а як да сьмерці клясавага чалавека, да сьмерці, якая вырвала з радоў пралетарскай рэвалюцыі адважнага барацьбіта за гэту рэвалюцыю на мастацкім фронце. Гэты верш прасякнуты глыбокім лірызмам. У гэтым вершы, паэт, зварочваючыся да Маякоўскага, гаворыць, што Маякоўскі адабраў ад рэвалюцыі не сваё жыцьцё, а адабраў барацьбіта за рэвалюцыю.

«... какое...
Какое
имел ты право
у революции
себя отнять?!.»

Калі гаворыць І. Шапавалаў пра краіну дыктатуры пралетарыяту, пра пралетарыят, як клясу,—ён гаворыць як пра вялізарную сілу, якая ўзьнялася на вяршыню гістарычнага працэсу, якая перамагае і пераможа на гэтым шляху.

Кажучы пра паэзію зборніка «Товарищ», як пра дадатную зьяву, як пра актыўны літаратурны фактар у працэсе сацыялістычнага будаўніцтва, у працэсе перароблі псыхікі чалавека, не адмаўляючы паэтычных здольнасьцяй маладога паэты, нельга не заўважыць, што ў І. Шапавала ёсьць пэўная небясьпечная рыса, якая для далейшай яго творчай практыкі можа зьявіцца значнай перашкодай, можа прывесьці на няправільныя пазыцыі маладога аўтара.

У чым гэта рыса выражаецца?

У тым, што малады паэта не імкнецца тую, ці іншую рэч, зьяву ператварыць у поўнакроўны вобраз, даць пра свой творчы аб'ект канкрэтнае ўяўленьне, раскрыць па-мастацку сувязь, узаемадзеяньне аб'ектаў з рэчаіснасьцю, а ён толькі абмяжоўваецца падачай агульнага ўяўленьня пра аб'ект, апавіваючы гэты аб'ект у лёзунговую форму.

У адным мейсцы ён прама і заўляе:

«Нам нужно
Искусство ведущее в бой,
а не копающееся
в психологическом соре».

Гэта па сутнасьці літфронтаўская рыса ў паэзіі выцякае з няўдалай яго вучобы ў Маякоўскага. Побач з каштоўным бокам творчасьці Маякоўскага,—яго рэвалюцыйнасьцю, уменьнем змагацца з ворагам,—І. Шапавалаў адмаўляе псыхолёгізм мастацтва.

У далейшай творчай практыцы І. Шапавалаву неабходна ісьці па лініі большага паглыбленьня ва ўнутраную складанасьць аб'екту, па лініі стварэньня поўнацэннага вобразу, захоўваючы рэвалюцыйнасьць, баявізм, клясавую выразнасьць вершу.

У заключэньне патрэбна адзначыць на досыць удалае мастацка-тэхнічнае афармленьне кніжкі. Мастак В. Сокалаў удала схапіў зьмест кніжкі, яе стылёвыя асаблівасьці. Мастацкае афармленьне дапаўняе і ўзмацняе рытміку і дынаміку вершу.

ІЗІ ХАРЫК

З паэмы „Душой і целом“

Хай слова бярэ хто-нібудзь

Сыходзіўся натоўп у палац,
Камін палыхаў-траскацеў.
І ціш залатая упала
На шэрань закураных сьцен.
На цьвёрдыя, смуглыя твары,
На космы кудлатых барод.
І натоўп гусьцеў захаваўся,
Задумна натупіўшы ўзрок.
Смактаў хтосьці люльку-крывулю,
А хтосьці,—сваю бараду.
—«Гляньце!
Вы што там—заснулі?!
Хай слова бярэ хто небудзь!»
А... а... раскрышылася ціша
Узблытана—ўзьнятых руках.
Крыўляюцца цені, калышуць
На сьветла-здымлёных сьцянах...

І яна ўгледзіла

Запрацаваны натоўп слухаў моўчкі, сеўшы ў кола,
А яна не гаварыла, толькі разважала ў голас...
Нечакана і яна адчула слабасьць-змору.
А калі празрыстасьць ночы зьвісла ў прасторы,—
Як хацелася-б узьлесьці на званіцу й —бах!
Раззваніцца!! —
Раззваніцца!!
Раззваніцца!!
У мэталічным рыку
Заскаголяць зовы-тоны, загалосіць стынь.
Зараз белае мястэчка з урачыстым крыкам
Спавіецца-прыбярэцца ў дым.
Будуць рваца
прэч!—
ад хатак,
ад мястэчак,
У вагонь кідаць з праклядцем
Скарб ліхі.
У захапленьні будуць кленчыць,
Кленчыць,
Кленчыць,
Ад старога мястэчка,—загінь.
І з рудавак,
Чорных слотаў
і балотаў
Торфу тлустага нацягнуць соткі гор,
Разрасьцецца, разгарыцца жыцьцё тут
У дыме... Пары...
быцца кроў, яго па дротах
Паплыве ў калгасны яр і касагор...
. . . . :
. . . . :
А можа і таму, што гаварыла шмат,
А можа і таму, што распаўзлася цьма
І абняла прастор бялявай ночай,—
Натоўп раптоўна з мейсца ўскочыў!
І застыў...
А яна накашляла... Схапілася за сэрца...
Зачырванелася... Затым — бялей ад сьмерці...
І папрасіла ціхенька: «ва-ды-ы».

Вяртаньне

Вяртаньне.
Зімнія туманы.
Ад санак і да зорак чутна:
На маладыя сэрцы п'яна
Кладзецца мяккі сьнег ціхутка...
Шлях ляжыць праменьням абсыпаны,
Зьвініць мароз на асьветленых далях.
Хочацца сьмяяцца!
Шпаркае дыханьне
З поту маладога белым дымам валіць...
—«Едзь хутчэй!»—
А ён пружыніць лейцы.
—Едзь хутчэй!»—
Ня слухае, сьмяецца...
—«Гэй-ты доўга будзеш у маўчаньні?
На мяне глядзець так, слухай!»
Яна ў санёх падскочыла і—«рухай!!»
Захапіла лейцы ў нарываньні.
І рвануўся конь і разагнаўся,
І рвануў зямлю і паімчаўся,
Жарыць-шпарыць рысьсю й галёпам
Жарыць-шпарыць рысьсю—
Гальлё-е-е!!
. . . . :
. . . . :

З яўрэйскай мовы І. ПЛАЎНІК.

Памёр П'ер Дэгэйтэр

2-га кастрычніка звыш 50 тысяч рабочых ішло за труной памёршага ў Сэн-Дэні на 83-м годзе жыцьця аўтара музыкі «Інтэрнацыяналу» П'ер Дэгэйтэр, бэльгіец па паходжаньню, рабочы рэзчык па дрэве, з юнацтва захапляўся музыкай і сьпевамі. Ён вучыўся ў Лільскай кансэрваторыі, арганізаваў сярод рабочых харавыя гурткі. Ён стварыў і сам шэраг песьняў, сярод іх і наш гімн. Словы «Інтэрнацыяналу» ён узяў у паэта-камунара Эйжэна Пот'е, які напісаў свой славуты верш пасьля разгрому Парыскай Камуны ўлетку 1871 году ў Парыжы у час, калі ён хаваўся ад версальскіх катаў. Шырокае распаўсюджаньне верш атрымаў тады, калі П'ер Дэгэйтар напісаў да яго музыку. Упяршыню выканана на сходзе песьня была ў 1888 годзе лільскімі рабочымі. Яна стала шырока распаўсюджвацца сярод рабочых, але спроба надрукаваць яе, спроба, якая была зроблена ў 1894 годзе, выклікала судовае прасьледваньне за страфу, у якой гаворыцца пра вайсковую стачку і далучэньне салдат да народу. Але ніякае прасьледваньне не магло спыніць песьню на яе шляху да сэрца рабочае клясы.

У 1896 годзе на зьезьдзе французскай рабочай партыі ў Ліле дэлегаты розных дэпартамантаў вывучылі гэту песьню, і, у сваю чаргу, распаўсюдзілі яе на мясцох. У 1899 годзе на кангрэсе францускіх сацыяліста у Парыжы «Інтэрнацыянал» быў прыняты ўсімі дэлегатамі, зрабіўшыся з гэтага часу гімнам французскае рабочае клясы. У 1902 годзе словы «Інтэрнацыяналу» былі перакладзены на расійскую мову. Так у сумеснай творчасьці двух рабочых узьнікла песьня, якая стала гімнам пралетарыяту, гімнам сусьветнай рэвалюцыі.

У 1928 годзе П'ер Дэгэйтар быў у Савецкім Саюзе, прысутнічаў на VI кангрэсе Камінтэрну.

Над яго магілай выступалі з прамовамі Дорыё і Кашэн, якія падкрэсьлілі, што П'ер Дэгэйтар да апошняй хвіліны жыцьця застаўся верным рабочай клясе. Яго пахаваньне ператварылася ў вялічэзную палітычную дэманстрацыю.

ПРАФ. А. І. БАРЫЧЭЎСКІ

Паўлюк Ананьнеў

Гэтымі днямі мы даведаліся, што на курорце ў Гаграх памёр ад пароку сэрца паэт-камсамолец Паўлюк Ананьнеў.

Нарадзіўся т. Ананьнеў у 1905 годзе ў беднай сялянскай сям'і (вёска Андрэсковічы Горкаўскага с-савету, Гарадокскага раёну). У 1928 годзе Паўлюк Ананьнеў скончыў Віцебскія 2-х гадовыя пэдкурсы, пасьля чаго два гады настаўнічаў. У апошні час вучыўся ў Вышэйшым Пэдінстытуце на 2-м курсе літаратурнага факультэту (крытычна-творчая сэкцыя).

Друкавацца пачаў у газэце «Віцебскі пралетары». З 1930 г. друкаваўся ў цэнтральным пэрыядычным друку. У 1932 годзе вышла яго першая кніжка вершаў «Героіка дзён» і калектыўная з А. Ушаковым «Рабочы пульс».

Ячэйка КСМ савецкіх пісьменьнікаў выказвае глыбокі жаль з прычыны раптоўнай сьмерці камсамольца, паэта і таварыша.

Бюро ячэйкі КСМ пісьменьнікаў.

Р. ГАЛУБІЦКАЯ

Ці правільна разважае таварыш Красьнеўскі?

(Пра „Напор“ Александровіча БДзТ-2)

Тав. Красьнеўскі [1]) ня без падстаў знаходзіць, што «Напору» нечага не хапае. Ён мае радыю, калі кажа пра адзіную асноўную ідэю, якой няма ў п'есе. Але ён не знаходзіць, што п'есе яшчэ не хапае «філёзофіі». Далей, у іншым мейсцы ён гаворыць пра «анты-філёзофскі» эмпірызм.

І вось гэта—бяссэнсіца. Можна ставіць пытаньне пра тое, што праблема, пастаўленая ў «Напоры», ня была філёзофска-паглыбленай, можна гаварыць пра неакрэсьленасьць філёзофіі, нарэшце, можна сказаць пра «жабрацтва» філёзофіі, але сказаць пра «анты-філёзофію» не магчыма, бо такога паняцьця ня існуе.

Гэта будзе бяссэнсіца.

Чаму, па думцы Красьнеўскага, ня можна ўжываць масавыя фізкультурныя сцэны, выходзячы з «прынцыпова-ідэёвае ўстаноўкі»? Чаму фізкультурная сцэна ня можа мець у сябе добрай і здаровай думкі пра выхаваньне моцнага цела ў нашай моладзі?

«Напор» — гэта жыцьцярадасная п'еса пра побыт моладзі. Яна ня мае ў сабе яскравай ідэёвай мэтаімкнёнасьці зусім не таму, што яна мае сваей галоўнай тэмай побыт, а таму, што п'еса гэта сюжэтна аслабленая і тэматычна распыленая.

Александровіч, стварыўшы твор, які даводзіць яго паэтычны рост, не зрабіўся драматургам. Яму не ўдалося аўладаць сцэнічна сканцэнтраванай і ідэёва-мэтаімкнёнай тэмай. Паводле замыслу, «Напор» павінен быў быць п'есай пра пабыт камсамольскай моладзі на фоне агульнага вытворчага жыцьця з усімі яго супярэчнасьцямі. І асноўная памылка аўтара была ў тым, што замест таго, каб захаваць фон заводзкага жыцьця, умовы разьвіцьця якога спрыялі больш яскраваму паказу здаровага побыту моладзі, замест гэтага Александровіч узяў гэты фон у дзёю самой п'есы, зрабіў яго амаль поўнапраўным элемэнтам у п'есе.

Вось чаму атрымліваецца такі разнабой у «Напоры», вось чаму п'еса траціць акрэсьленую мэтаімкнёнасьць. Невядома на што напор у п'есе: на арганізацыю культурнага побыту ці на сьвядомую працу.

Пастаноўшчык толькі паглыбіў гэтую распыленасьць. Ён, выкарыстаўваючы другой тэмы, якая, як відаць ўсё-ж не ляжыць у аснове п'есы, той, якая павінна іграць ролю фону, траціць пачуцьцё меры.

Эпізод з ліквідацыяй прарыву (перакідваньне бярвеньняў) цягнецца вельмі гоўга, у вялікай статыцы, якая ня рухае наперад ні думкі, ні дзеі.

Замест максымальнага скарачэньня фонавага матар'ялу, за кошт большага яго сцэнічнага завастрэньня, атрымалася няўстойлівасьць мэтаімкнёнасьці ў пастаноўцы, распылённасьць думкі ў ёй. Гэта, зразумела, ні ў якім разе не азначае ідэёвай няўстойлівасьці, ці антыфілёзофіі»

У Александровіча, бязумоўна, зусім яскравыя дачыненьні да кожнага асобнага факту, але-ж што тычыцца сыстэмы гэтых фактаў, дык ідэёвая завостранасьць не дасягае кампактнасьці, канцэнтраванасьці. Яна застаецца вісець у паветры з-за таго, што расьсяваецца асноўная сувязь паміж некалькімі тэмамі, якія ня зьбіраюцца ў адно сюжэтнае цэлае (што асабліва важна ў драматургіі), а так і застаюцца да канца разрозьненымі і дыялектычная цэласьць п'есы парушаецца ня тым недахопам адзінства суб'екту з аб'ектам у тым сэнсе, у якім гэта разумее Красьнеўскі.

Можна згадзіцца з Красьнеўскім, калі ён кажа, што Александровіч «не знайшоў магчымасьці даць поўнае мастацкае тлумачэньне акрэсьленай часткі савецкай рэчаіснасьці».

Але калі ён дадае да гэтага яшчэ, што Александровіч ня даў правільнага тлумачэньня рэчаіснасьці, дык гэта зусім няправільна.

Чым гэта даводзіць Красьнеўскі? Тым, што ў п'есе няма рэалістычнае тыпізацыі вобразу, «мы бачым на сцэне людзей»,—кажа Красьнеўскі,—«якія не гавораць, а равуць, не сьмяюцца, а выюць».

Тут зноў Красьнеўскі дапускае памылку: ён не адрозьнівае п'есы ад пастаноўкі. Няўжо тое, што «людзі равуць, ці выюць» мае дачыненьне да недахопаў п'есы? Гэта асаблівасьць, якая была прынесена тэатрам у гратэскавую трактоўку п'есы. Наогул уся пастаноўка задумана менавіта ў такім пляне, у пляне гратэскавай падкрэсьленасьці. Іншая справа, што гэтая гратэскавая падкрэсьленасьць разьбіваецца мясцамі аб натуралістычна-псыхолёгічную трактоўку некаторымі акторамі сваіх роляй (напрыклад Вялікі, Мер'ема), але вернемся да вобразаў. Няўжо сапраўды вобразы Александровіча гавораць аднэю і тэ-ж выкрунтаснай афарыстычнаю моваю? Хіба не мае на сабе сьледу сьвядомасьці своеасаблівая фігура сучаснага «недарасьля» са сваім недарэчным «а чаму»? Хіба ня цікавы такі эпізадычны пэрсанаж, як камсамолец, які апэрыруе цытатамі, які, ня гледзячы на свой казённы выгляд псэўда-эрудыта, усё-ж застаецца добрым і задушэўным таварышом? Шмат здаровага гумару закладзена ў фігурах Крода і Юзэфы, якія, чамусьці, «ня цікавяць» Красьнеўскага.

Асноўнай памылкай Красьнеўскага зьяўляецца тое, што ён раўнуе раўналежна «Напор» і «Стрэл» Бязыменскага тымчасам, калі творчыя мэтады гэтых двух рэчаў зусім розныя.

«Стрэл» — дэманстрацыйна схэматычная п'еса, на адным баку якой стаіць благое, а на другім добрае. Прычым і благое і добрае ў п'есе так ненатуральна павялічваецца, што набывае вялізарныя гіпэрбалізаваныя памеры.

У «Стрэле» ня толькі гіпэрбалізаваны схэматызм вобразаў, але і ўсе канцэпцыі п'есы, тымчасам, як у «Напоры» ня столькі схэматычны самы вобраз, колькі сутычка, узаемадачыненьні вобразаў. І схэматызм тут мае іншую прыроду. Тут схэматызм не арганічны, схэматызм, які ідзе ад няўмельства аўтара будаваць драматургічны твор, тымчасам, як у «Стрэле» гэты схэматызм дэманстрацыйны.

Вось у гэтым і парушаецца дыялектычнае адзінства суб'екта з аб'ектам у «Напоры». Парушэньне гэта ствараецца іманэнтным разьвіцьцём вобразаў. Вобраз у п'есе ствараецца сам па сабе без узаемадачыненьняў з вонкавым асяродзьдзем у самой п'есе.

Таму вобраз застаецца статычным, які ня рухае разьвіцьця дзеі, ня ўплывае на яе.

Вось у чым складаецца парушэньне адзінства суб'екта пэрсанажу п'есы з аб'ектам—сацыяльным асяродзьдзем п'есы.

Як-жа Красьнеўскі раіць пераапрацаваць «Напор», для нас так і засталося незразумелым. Ён проста пра гэта нічога не гаворыць. Ён дадае яшчэ адзін мінус пра цырковы натуралізм (забываючыся на тое, што цырк гэта—ўжо эксцэнтрызм) і на гэтым канчае.

Нам здаецца, што пастаноўка, павінна быць перароблена менавіта па лініі тэатру больш, як па лініі другога турга, таму, што ў драматурга памылкі ідуць ад яго слабасьці, як драматурга.

Пастаноўка павінна будавацца ў пляне камсамольскае апэрэты, прычым яна павінна быць умацавана больш дасканалай рэжысэрскай работы з акторам, каб сцэнічная трактоўка ролі кожным паасобным акторам ня выпадала з агульнага пастановачнага пляну.

Пастаноўцы «Напору» у апэрэтычным пляне спрыяе цэлы шэраг асаблівасьцяй яго, як няглыбокая праблематычнасьць п'есы, складанасьць да камэдыі, (вялікі запас гумару) і, нарэшце, сама вершаваная форма, якой напісана ўся п'еса, і якая спрыяе таму, каб пакласьці яе на музыку.

Тэатру лягчэй яе перапрацаваць у такім напрамку, бо ў пастаноўцы ёсьць элемэнты апэрэты, а побач з living разнастайнай трактоўнай паасобных роляй, з момантам працягнутасьці некаторых сцэн апэрэтачнасьць гэтая расьсяваецца.

Нашы тэатры ў сваіх змаганьні за якасьць, павінны ўзьняць свае пастаноўкі на такую вышыню, каб ім самім змагацца з нядобраякаснай крытыкай тыпу рэцэнзій Красьнеўскага.

[1]) Р. Красьнеўскі—Рэцэнзыя пра «Напор»—«ЛІМ», № 16.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны тав. рэдактар!

Артыкул тав. Дунца аб маей творчасьці я чытаў у яўрэйскім арыгінале. Мяне зьдзіўляе, што ў гэтым самым артыкуле зьмешчаным у апошнім нумары «Літаратура і Мастацтва» выпала тая частка артыкулу, якая падкрэсьлівала дадатныя моманты маей апошняй кнігі «Зэльменянцы». Было-б неабходным высьветліць, чым тлумачыцца такі контэкст перакладу памянёнага артыкулу.

З пашанай М. КУЛЬБАК.

Ад рэдакцыі. Артыкул Дунца пра творчасьць М. Кульбака быў перакладзены ў час адсутнічаньня аўтара. Некаторыя скарачэньні былі патрэбны, але скарачэньне менавіта гэтай часткі, пра якую піша т. Кульбак зьяўляецца недаглядам рэдакцыі.

Апушчаны разьдзел артыкулу менавіта падкрэсьлівае вялікія дасягненьні Кульбака ў яго апошняй кнізе ў сэнсе бязумоўнага набліжэньня да правільнага ўспрыманьня працэсаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Адказны радактар Х. ДУНЕЦ

РЭДКАЛЕГІЯ: А. Александровіч, Ахрэмчык, В. Вольскі, Гелкін, І. Гурскі, Х. Дунец, М. Лыньків, Модэль, С. Нортман, М. Рафальскі, А. Рымашэўскі, І. Харык, К. Чорны.

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

Друкарня імя Сталіна Менск

Упаўнаваж. Галоўліту № А—668